5-2008

# ARCHE

п а ч а т а к

5-2008



**ARCHE 5 (68)**

**травень 2008**

5-2008 ARCHE 5-2008

**Навуковы, навукова-папулярны, грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «ARCHE Пачатак» выдаецца зь верасьня 1998 году штомесяц.**

**РЭДАКЦЫЯ:**

**Валер Булгакаў** — галоўны рэдактар
**Віктар Жыбуль** — рэдактар
**Алена Казлова** — сакратарка рэдакцыі
**Аляксандра Макавік** — рэдактар
**Сяргей Макарэвіч** — распаўсюднік

**ARCHE is a Partner of European Cultural Journals Network Eurozine (www.eurozine.com)**

**Адрас для допісаў:** ARCHE, а/с 3, 220018, Менск-18.
**E-mail:** arche@arche.org.by.

Часопіс можна замовіць у распаўсюднікаў:

**Баранавічы** — Руслан Равяка, п/с 13, 225409, Баранавічы-9, тэл. (029) 767-20-37.

**Барысаў** — Алег Лучына, п/с 714, 222120, Барысаў-1, тэл. (029) 33-99-161.

**Берасьце** — Ігар Бараноўскі, тэл. (0162) 25-61-55.

**Віцебск** — Барыс Хамайда, тэл. (0212) 34-52-41.

**Гомель** — Ларыса Шчыракова, тэл. (029) 341-66-94; Дзяніс Федарэнка, тэл. (029) 733-55-22.

**Полацак** — Алесь Аркуш, тэл. (0214) 41-85-19.

**Магілёў** — Алесь Асіпцоў, тэл. (0222) 25-57-85, (029) 625-57-85.

**Менск** — Сяргей Макарэвіч, тэл. (029) 505-39-11.

Шукаем распаўсюднікаў зь іншых мясьцінаў.

**Падпіска на часопіс «ARCHE Пачатак» прымаецца ўва ўсіх аддзяленьнях «Белпошты».**

**Заснавальнік:** Андрэй Дынько.
**Выдавец:** установа «Рэдакцыя часопісу «Архэ-Пачатак».
Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 530 ад 4.05.2001.
ISSN 1392-9682
**Юрыдычны адрас:** вул. Нававіленская 24/1А, каб. 2П, 220053, Менск.
Цана дамоўная.

Рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе рукапісаў. Рэдакцыя рэдагуе матэрыялы, прынятыя да друку.

Падпісана ў друк 20.06.2008.
Выход у сьвет 29.06.2008. Фармат 70х100 1/16.
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная. Ум. друк. арк. 33.
Наклад 300 асобнікаў. Замова

Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка ў друкарні ТАА «Палікрафт», вул. Кнорына, 50, 220103, Менск.

У афармленьні першай старонкі выкарыстан фотаздымак з выявай сьвяткаваньня першамаю ў акупаваным Менску. 1943 г. Дызайн Ягора Шумскага.
У нумары выкарыстаныя ілюстрацыі з архіву Ўладзімера Ляхоўскага.

© «ARCHE Пачатак», 2008

**Падпісны індэкс 00345**

**ARCHE on-line:** http://arche.org.by

5-2008 ARCHE ПАЧАТАК 5-2008

## ЗЬМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| **АД РЭДАКТАРА** | **5** | Вайна без цэнзуры |
| **АНАЛІТЫКА** | **9** | **ЯН КЕРШО** Міт пра Гітлера |
| | **43** | **ПЭР РАДЛІНГ** Вялікая Айчынная вайна ў сьвядомасьці беларусаў |
| **КРЫТЫКА** | **65** | **МАРАК ЯН ХАДАКЕВІЧ** Палякі-фашысты супраць саветаў-акупантаў. Закулісьсе партызанскай вайны ў Беларусі |
| | **87** | **АНДРЭЙ ПАЧОБУТ** Байкі для патрыётаў |
| **ГІСТОРЫЯ** | **94** | **УВЭ ГАРТЭНШЛЕГЕР** Горад Менск пад нямецкай акупацыяй (1941—1944) |
| | **260** | **ЛЕАНІД РЭЙН** Праваслаўная царква ў Беларусі за нямецкай акупацыяй (1941—1944) |
| | **295** | **ВІЛЬГЕЛЬМ МОЗЭЛЬ** Дэпартацыя гамбурскіх габрэяў у Менск |
| | **343** | **ЛЕАНІД РЭЙН** Удзел мясцовых калябарантаў у «канчатковым вырашэньні» яўрэйскага пытаньня ў акупаванай Беларусі |
| | **386** | **ЛЕАНІД СЬМІЛАВІЦКІ** Антысэмітызм у савецкім партызанскім руху на прыкладзе Беларусі (1941—1944) |
| | **419** | **ЛІ БЭЙКЕР** Аналізуючы крах: новы погляд на апэрацыю «Баграціён» |
| | **452** | **ЛЕАНІД РЭЙН** Недачалавекі ўва ўніформе СС: 30-я вафэн-грэнадзёрская дывізія Вафэн СС |
| **РЭЦЭНЗІІ** | **497** | **ПЭТЭР КЛЯЙН** Пра паліцыю парадку ў Райхскамісарыяце «Остлянд» |
| | **501** | **ГЮНТЭР БІШАФ** Сталін вельмі захапляўся Гітлерам |
| | **504** | **СТЫВЭН Г. ФРЫЦ** Перамога за цану паражэньня |

5-2008
ARCHE
ПАЧАТАК
5-2008

# CONTENTS


NALYSES 5 The Uncensored War

ANALYSES 9 **IAN KERSHAW** The Führer Myth

43 **PER ANDERS RUDLING** The Great Patriotic War and National Identity in Belarus

CRITICISM 65 **MAREK JAN CHODAKIEWICZ** Poles-fascists versus Soviets-occupiers. Hidden Aspects of Guerilla Warfare in Belarus

87 **ANDREJ PAČOBUT** The Tales for Patriots

HISTORY 94 **UWE GARTENSCHLAEGER** Minsk City under German occupation (1941—1944)

260 **LEONID REIN** The Orthodox Church in Belarus under Nazi Occupation (1941—1944)

295 **WILHELM MOSEL** Hamburg Deportation Transport to Minsk

343 **LEONID REIN** «Final Solution» in Nazi-Occupied Belarus

386 **LEONID SMILOVITSKY**Antisemitism in the Soviet Partisan Movement, 1941—1944: The Case of Belarus

419 **LEE BAKER** Explaining Defeat: A Reappraisal of «Operation Bagration,» 1944

452 **LEONID REIN** Untermenschen in SS Uniforms: 30th Waffen-Grenadier Division of Waffen SS

REVIEWS 497 **PETER KLEIN** On Ordnungspolizei in Reichskommissariat Ostland

501 **GÜNTER BISCHOP** Stalin Very Admired Hitler

504 **STEPHEN G. FRITZ** The Victory at the Price of Defeat

# Вайна без цэнзуры

## Ад рэдактара

Як мала сярэдні беларус ведае пра падзеі, якім у Беларусі прысьвечаны тысячы кніг, тэлеперадач і газэтных артыкулаў! Не ў апошнюю чаргу таму, што рэканструкцыя хады апошняй вайны траўмуе лідэраў і ідэолягаў аўтарытарнай Беларусі. Палітыка і ідэалёгія аўтарытарных рэжымаў мае шмат супольнага з палітыкай і ідэалёгіяй нацысцкай Нямеччыны — і ў першым, і ў другім выпадку яму спадарожнічае варажнеча да ўнутраных і зьнешніх ворагаў, маркіраваньне іх як пятай калёны, неадменная барацьба з карупцыяй, якая часта служыць трамплінам будучых аўтакратаў ува ўладу, чысткі кадраў (бо чыноўнічая кар'ера залежыць не ад народнага волевыяўленьня, а ад волі вярхоўнага палітычнага лідэра), культ сілы і моцнай дзяржавы (што раней ці пазьней абарачаецца гаспадарчым хаосам, маральным раскладам і новымі хвалямі карупцыі, бо недэмакратычныя рэжымы з пэрсаніфікаваным лідэрам ставяць не на разьвіцьцё і ўмацаваньне эфэктыўных дзяржаўных інстытутаў, а завязваюць дзяржаву, нават часамі яе тэрытарыяльную цэльнасьць, на сябе саміх), напышлівыя парады і публічныя цырымоніі дэманстрацыі адзінства народу і кіраўніцтва, і нарэшце ўсенародная любоў да адзінаасобных палітычных лідэраў.

Апошнія, як правіла, схільныя да тэатральнасьці і палітычнай клаўнады, публічна адмаўляюць хрысьціянскую этыку, думаючы, што гэта іх узмацняе, на карысьць маральнай індыфэрэнтнасьці, падкрэсьліваюць сваё паходжаньне з народу, жорстка вынішчаюць апазыцыю, выступаюць супраць Амэрыкі, вітаюць парады фізкультурнікаў і вайсковай тэхнікі, у чоткім напружаным рытме рэалізуюць пяцігадовыя ці чатырохгадовыя пляны (у нацысцкай Нямеччыне адказным за выкананьне чатырохгадовага пляну быў Гёрынг), выкарыстоўваюць спарто-

выя палацы для масавых зборышчаў сваіх прыхільнікаў і заахвочваюць усё-ўладзьдзе сілавых ведамстваў і спэцслужбаў.

Праўда, паміж першымі і другімі ёсьць і тонкая мяжа. Сёньня палітычныя аўтарытарызмы не практыкуюць масавых забойстваў і працяглага кровапраліцьця — у сучасны інфармацыйны век для дасягненьня аўтарытарных мэтаў існуюць больш вытанчаныя інструмэнты.

У гэтым адна з прычын цэнзураваньня гісторыі апошняй вайны: цяперашняй аўтарытарнай уладзе ня выгадна, каб узьнікалі такія паралелі. Таму нямецкі нацыянал-сацыялізм у Беларусі традыцыйна малюецца не як папулісцкая палітычная ідэалёгія, сваім уздымам абавязаная развалу былой імпэрыі, гучным лёзунгам барацьбы з карупцыяй і росту народнага дабрабыту, а як выключна заходнеэўрапейскае, чужое нам расавае веравучэньне, якое ўзьнікла і разьвілося як бы само па сабе. Падаксальна, але пры ўсёй мімікрыі афіцыйнай прапаганды ў бок інтэрнацыяналізму і міжнацыянальнага міру ўяўленьне пра нямецкую акупацыю было і застаецца прасякнутым духам этнічнай нянавісьці. Міталягічную прыроду ідэалягічнага процістаўленьня «азьвярэлы нацызм»/«міралюбны савецкі камунізм» лішні раз падкрэсьлівае факт, што носьбіты першага, немцы, будучы аб’ектам калектыўнай нянавісьці, выступаюць фактычна як закрытая гамагенная супольнасьць.

Такія паралелі нязручныя для афіцыйнага боку і таму, што разбураюць міт пра ўсёмагутнасьць савецкай сыстэмы. І рэч ня толькі ў панічных уцёках савецкіх функцыянэраў зь Менску ўжо на чацьверты дзень вайны. Любая палітычная сыстэма, якая грунтуецца на памянёных вышэй вартасьцях і прынцыпах, антыгуманная і недаўгавечная. У памнажэньні на яе некампэтэнтнасьць (прычым ня толькі з савецкага, але ў вялікай ступені і нямецкага боку; само абвяшчэньне вайны супраць СССР было вынікам недаацэнкі рэальнага ваеннага і эканамічнага патэнцыялу гэтай дзяржавы) гэта дало дзясяткі мільёнаў прамых ахвяраў і сотні мільёнаў пакалечаных лёсаў.

Аўтарытарныя лідэры звычайна робяць усё для таго, каб адцягнуць крах створанай імі сыстэмы да моманту, калі яны будуць ужо ў магіле. Паралелі з апошняй вайной не пакідаюць сумневу, наколькі ўнутрана ўразьлівы нязломны на першы погляд аўтарытарны (ці таталітарны) маналіт: нават ацалелы ў сьмяротным сутыкненьні бок раней ці пазьней чакае непазьбежны крах. Такая гістарычная плата за жудасную неэфэктыўнасьць і мільёны загубленых жыцьцяў.

І нарэшце пра палітыку ідэнтычнасьці. Спадчына апошняй вайны складае адну з ідэалягічных нэрваў беларускай сучаснасьці і застаецца асновай ідэалягічнага супрацьстаяньня. Афіцыйны бок дагэтуль выкарыстоўвае міталёгію апошняй вайны ў мазураўска-брэжнеўскай упакоўцы для легітымізацыі сваіх прэтэнзій на ўладу і публічнага зьнішчэньня сваіх палітычных апанэнтаў. Апошнія ў 2008 г. выстаўляюцца тайнымі або нават яўнымі прыхільнікамі нацыстаў або пранацысцкіх калябарантаў.

У афіцыйных выданьнях апошняга часу на тэму вайны[1] вы сустрэнеце максымум прапаганды і мінімум суперажываньня. Ідэалягема ўсенароднай барацьбы зь нямецка-фашысцкімі акупантамі забараняе ўяўленьне пра маштаб беларускай калябарацыі. Падбор фотаілюстрацый у гэтых выданьнях такі самы, як і дваццаць ці сорак гадоў назад: абы не адысьці ад догмы пра масавы гераізм савецкага народу, зьверствы нямецка-фашысцкіх акупантаў і подласьць кучкі калябарантаў, абы схаваць свае амурнага гераізму і шаманскіх воклічаў пра дзікунства акупантаў, то выглядае, што мы маем справу не з навукай, а грубай і цынічнай прапагандысцкай маніпуляцыяй.

У дамарослых утопіях кансэрватыўна настроенай апазыцыі Беларусь 1941—1944 гг. паўстае малым залатым векам беларускага адраджэньня. Для яго канструяваньня выкарыстоўваюцца ўсё тыя ж прапагандысцкія прыёмы. Бадай усе рэкорды па ілжывасьці пабіла кніга Сяргея Ярша і Сержука Горбіка «Беларускі супраціў», якая рэцэнзуецца ў гэтым жа нумары «ARCHE».

Не пабаюся выказаць здогад, што акурат адсутнасьць адпаведнай рэфлексіі робіць гісторыю апошняй вайны ахілесавай пятой беларускага нацыяналізму. Парадаксальна, тры гады нямецкай акупацыі сапраўды далі яму штуршок, сталі парой яго ажыўленьня і колькаснага папаўненьня. (Не забываймася, што ў акупаваным Менску ўсе школы беларускія, а ў вызваленым Менску празь які дзясятак гадоў — спрэс расейскія.)

Аднак адсутнасьць належнай дыстанцыі і рэфлексіі праз сорак-пяцьдзясят гадоў пасьля заканчэньня вайны спрычыніліся да разгрому нацыянальна-дэмакратычнага руху ў другой палове 1990-х.

Вайна выявіла ня вельмі сымпатычныя праекцыі беларускага нацыяналізму. Аказалася, што ён можа быць таксама прастасавальніцкім, антыгуманным, служыць аб'ектам замежнай маніпуляцыі, а яго прыхільнікі могуць быць непераборлівыя ў выбары сродкаў палітычнымі апартуністамі. З старонак архіўных дакумэнтаў немцы часам здаюцца больш высакароднымі і па-свойму прынцыповымі, чым іх беларускія памагатыя.

Нарэшце, ваенны час агаліў крайнюю слабасьць беларускага нацыяналізму, яго аграмадную ізаляцыю ад грамадзтва.

Можна чакаць, што выхад гэтага нумару выкліча неўразуменьне і абвінавачаньні ўва ўгнюшваньні сьвятынь з абодвух бакоў. Сапраўды, яго лёгка закляйміць за рэвізіянізм і сьвятататцтва, за тое, што ён (з афіцыёзнай пазыцыі):

— выстаўляе ў непрыглядным сьвятле Чырвоную Армію і савецкі народ;

— абяляе садыста і ката В. Кубэ, які тут паўстае як драматург і ініцыятар археаграфічных раскопак ваколіцаў Менску;

[1] Кузьменко В. И., Токарев Н. В. Политика немецко-фашистских оккупационных властей в отношении научной интеллигенции Беларуси 1941—1944 гг. Минск: Белорусская наука, 2007. — 134 с.
Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 / А. А. Коваленя, А. М. Литвин, В. И. Кузьменко и др. — Минск: БелТА, 2005. — 544 с.

— асьвятляе сьлізкія тэмы, накшталт Менску пад нямецкай акупацыяй, напрыклад, пляны запуску водаправоду і каналізацыі;

— і, нарэшце, аналізуе стратэгіі выжываньня ў таталітарнай дзяржаве і супраціву яе ненажэрнаму малоху.

І з кансэрватыўна-нацыяналістычнага гледзішча:

— льле ваду на млын КДБ, выстаўлючы сапраўдных герояў беларускага Адраджэньня і Рэзыстансу калябарантамі і чужымі марыянэткамі.

Разумеючы гэта, мы стараліся рабіць гэты нумар як мага больш нэўтральным, г. зн. пры дапамозе аўтараў і тэкстаў, якія ня ўцягнутыя ўва ўнутранае ідэалягічнае процістаяньне.

Ён прысьвечаны падзеям, зьявам і постацям, інфармацыю пра якія ня знойдзеш у афіцыйных падручніках або нацыяналістычных апокрыфах. Напрыклад, што аснову дапаможных паліцэйскіх фармаваньняў у акупаванай Беларусі складалі былыя камуністы і камсамольцы, што нямала беларусаў ахвотна ўдзельнічала ў вынішчэньні жыдоўскага насельніцтва (характэрна, што мястэчка Ядвабнэ, дзе з прыходам нацыстаў мясцовае насельніцтва пры дапамозе нямецкай жандармэрыі спаліла жыўцом колькі соцень мясцовых жыдоў, знаходзілася на тэрыторыі тагачаснай БССР[2]), што хоць вэрмахт на пачатковых фазах вайны быў больш эфэктыўны, Сталін выявіўся пасьпяховым ваенным і палітычным кіраўніком.

Вівісэкцыя памяці — гэта культурнае злачынства. Толькі выяўленьне забароненых ідэалягічнымі цэрбэрамі тэмаў можа стварыць устойлівы імунітэт да нацызму і падобных чалавеканенавісьніцкіх палітычных сыстэм.

Гэты нумар «ARCHE» задуманы, каб стымуляваць мысьленьне і дыскусіі. Ён выдадзены, каб засвоіць урокі апошняй вайны.

[2] Гл. больш на гэты конт: Gross, Jan Tomasz. Neighbours: The Destruction of the Jewish Community in Jedwabne, Poland. Princeton University Press, 2001.

ІЯН КЕРШО

# Міт пра фюрэра

## 1. ЯК ГІТЛЕР ЗАВАЯВАЎ НЯМЕЦКІ НАРОД

Калі ў 1933 г. Гітлер зрабіўся канцлерам, шмат хто зь немцаў ставіўся да яго са скепсісам. Але неўзабаве прапагандысцкая машына, а таксама вайсковыя посьпехі ператварылі фюрэра ў лідэра нацыі. Пакланеньне Гітлеру паспрыяла катастрофе Трэцяга Райху.

«Сёньня Гітлер — гэта ўся Нямеччына» — газэтны загаловак за 4 жніўня 1934 г. сьведчыць, што адбыўся вызначальны перападзел улады. Два дні раней, калі памёр прэзыдэнт Райху Паўль фон Гіндэнбург, Гітлер, не марнуючы часу, скасаваў пасаду прэзыдэнта і прымусіў войска прынесьці асабістую прысягу безумоўнага падпарадкаваньня яму асабіста як «фюрэру Нямецкага Райху і народу». Ён стаўся галавою дзяржавы, вярхоўным галоўнакамандуючым узброенымі сіламі, кіраўніком ураду і манапольнай партыі ўлады — НСДАП. Гітлер атрымаў у Нямеччыне абсалютную ўладу, вольную ад якіх-кольвек канстытуцыйных абмежаваньняў. Аднак у загалоўку мелася на ўвазе нават нешта большае за карэнныя зрухі ў сузор'і ўлады: ставіўся знак роўнасьці паміж Гітлерам і краінай, якой ён кіраваў, паказвалася поўная лучнасьць паміж нямецкім народам і Гітлерам.

Прадэманстраваць гэтую лучнасьць меўся рэфэрэндум 19 жніўня 1934 г., прызначаны дзеля таго, каб надаць легітымнасьць ужо зьдзейсьненым зьменам у структурах улады і ў палітыцы. Праходзіў ён пад лёзунгам «Гітлер за Нямеччыну — уся Нямеччына за Гітлера». Аднак вынікі засьведчылі, што рэчаіснасьць не зусім адпавядала прапагандысцкай карцінцы. Паводле афіцыйных вынікаў,

***Іян Кершо*** *— прафэсар сучаснай гісторыі ўнівэрсытэту Шэфілду (The University of Sheffield). Выкладаў сярэднявечную, а пасьля сучасную гісторыю ўва ўнівэрсытэце Манчэстэру. У 1983—1984 гг. — запрошаны прафэсар сучаснай гісторыі Рурскага ўнівэрсытэту ў Бохуме. У 1987—1989 гг. — прафэсар сучаснай гісторыі ўнівэрсытэту Нотынгему, з 1989 — ува ўнівэрсытэце Шэфілду. Яго апошняя кніга выйшла пад назвай «Fateful Choices: Ten Decisions that Changed the World, 1940—1941» (London and New York: Penguin, 2007).*

больш як шостая частка выбарцаў не паддалася ціску і не прагаласавала «за». У некаторых вялікіх працоўных раёнах Гітлера не падтрымалі да траціны выбарцаў. Але нават пры гэтым адна-дзьве дэталі, на жаль, сьведчылі, што асабістая папулярнасьць Гітлера была вышэйшая, чым самаго нацысцкага рэжыму і тым болей НСДАП. «Адольфу Гітлеру — «так», але тысячу разоў «не» — карычневым «шышкам», — накрэмзаў нехта на адным бюлетэні ў Патсдаме. Тыя ж настроі адчуваліся і ў іншых мясьцінах.

Шмат што сьведчыла: за вонкавым пакланеньнем фюрэру, усячасна разьдзіманым прапагандай, Гітлер карыстаўся далёка не абсалютнай падтрымкай нават у сярэдзіне 30-х гг. XX ст. — пазьней гэты пэрыяд будуць згадваць як «добры час». Прыклад таго, што Гітлера жорстка крытыкавалі, можна знайсьці ў справаздачы Гестапа ў Бэрліне за сакавік 1936 г. У ёй адзначалася, што людзі моцна крытыкуюць Гітлера, бо ён трывае карупцыю і раскошу, якія пануюць сярод партыйнай вярхушкі, між тым як большасьць звычайных немцаў жыве ў беднасьці. Шмат у каго на вуснах было пытаньне: «Чаму фюрэр гэта трывае?» — паведамлялася ў справаздачы. Было відавочна, што «ў цяперашні час назіраецца крызіс даверу насельніцтва да асобы фюрэра».

## Забыліся ў эўфарыі

Аднак праз дзень пасьля таго, як была пададзеная справаздача, нямецкія войскі ўвайшлі ў дэмілітарызаваную зону Райну (Rhineland). Гэты красамоўны ход выразна выявіў слабасьць заходніх дэмакратыяў — Гітлер мог сьвяткаваць найвялікшую на той момант замежнапалітычную перамогу. Пра ўнутраныя праблемы папярэдніх месяцаў: дэфіцыт прадуктаў, высокія цэны, нізкія заробкі і непрыманьне рэжыму ў каталіцкіх раёнах праз змаганьне паміж царквой і дзяржавай — забыліся ў эўфарыі.

Так, абвешчаныя напрыканцы месяца вынікі выбараў, што суправаджаліся падтасоўкамі і апантанай прапагандысцкай кампаніяй, выглядалі абсурдна: паводле афіцыйных зьвестак, 98,9 % выбарцаў прагаласавалі «за Сьпіс і тым самым за фюрэра». Аднак нельга забывацца, што рэмілітарызацыя Райнскай вобласьці, бясспрэчна, сталася надзвычай папулярным крокам — яго, як правіла, прыпісвалі сьмеламу і дасьведчанаму кіраваньню Гітлера. Ёсьць шмат доказаў, што за чатыры гады пасьля сьмерці Гіндэнбурга і да захопу Аўстрыі і Судэтаў Гітлеру ўдалося заваяваць падтрымку пераважнай большасьці нямецкага народу — а гэта мела неацэнную значнасьць для палітычнага курсу Нямеччыны, які прывёў да катастрофы. Гітлер ніколі не карыстаўся такой папулярнасьцю, як у 1938 г., на піку ягоных замежнапалітычных посьпехаў — хіба што адразу пасьля нечуванай перамогі над Францыяй у 1940 г.

Сэбасьцян Хафнэр небеспадстаўна лічыў, што да 1938 г. Гітлер здолеў заваяваць падтрымку «вялікай большасьці ад той большасьці, што прагаласавала ў 1933 г. супраць яго». Хафнэр нават меркаваў, што на той час Гітлер аб'яднаў вакол сябе ўвесь нямецкі народ, што больш за 90 % немцаў «верылі ў фюрэра». Калі няма ніякіх аб'ектыўных зьвестак пра стан грамадзкае думкі, ва ўмовах за-



Гітлер за рабочым сталом



Нацысцкі салют на бэрлінскім стадыёне падчас Алімпійскіх гульняў 1936 году



Усенямецкі бацька (прапагандысцкае фота Гайнрыха Г. Гофмана)



Вясёлы Гітлер (прапагандысцкае фота Г. Гофмана)




Гітлер сярод нацысцкіх баевікоў. На сьцягу відаць асноўны нацысцкі лёзунг 1930-х: «Нямеччына, прачніся»





Райхстаг стоячы вітае аншлюс Аўстрыі. 1938 г.



Гітлер і Мусаліні ў Вэнэцыі. Чэрвень 1934 г.



Усенародны любімец



Ч. Чаплін у фільме «Вялікі дыктатар», які быў забаронены як у гітлераўскай Нямеччыне, так і ў сталінскім СССР



Гітлер прымае Гёрынга ў сваёй летняй рэзыдэнцыі



Фюрэр — апора пэнсіянэраў (прапагандысцкае фота Г. Гофмана)



Маладыя нацыянал-сацыялісты



Урачыстае сьвяткаваньне дня заснаваньня Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыі. 1934

палохваньня і рэпрэсіяў супраць тых, хто мог бы адважыцца запярэчыць афіцыйнай прапагандзе, калі ў якасьці грамадзкае думкі тыражавалася толькі пазыцыя органаў улады, падобная лічба можа быць толькі вынікам здагадак. Напэўна, яна завышаная. Але разам з тым, цяжка адмаўляць, што пасьля 1933 г. нацысцкі рэжым дамогся шырокай падтрымкі, у вялікай ступені дзякуючы асабістым «дасягненьням» Гітлера — прынамсі, так іх успрымалі людзі. Прапагандысцкая машына сваімі няспыннымі высілкамі падкрэсьлівала асабістыя заслугі Гітлера ў «посьпехах» рэжыму. Прапаганда сьвядома скіроўвалася на стварэньне і ўмацаваньне «гераічнага» вобразу Гітлера — магутнага генія. У выніку ў 1941 г. Ёзэф Гёбэльс у нейкай ступені меў рацыю, калі сьцьвярджаў, што стварэньне Міту пра фюрэра — найвялікшае дасягненьне прапаганды.

## Маімі ўласнымі высілкамі

Лепш за ўсіх перадаў сутнасьць гэтага прапагандысцкага іміджу сам Гітлер у прамове ў Райхстагу 28 красавіка 1939 г. (яе таксама цытуе Хафнэр):

*Я пераадолеў у Нямеччыне хаос, аднавіў парадак, дасягнуў велізарнага росту вытворчасьці ва ўсіх галінах нашай нацыянальнай эканомікі... Я здолеў зноў цалкам заняць у карыснай вытворчасьці тыя сем мільёнаў беспрацоўных, чый лёс гэтак ляжаў нам на сэрцы... Я ня толькі палітычна аб'яднаў нямецкую нацыю, але і наноў яе ўзброіў, і я імкнуўся надалей аркуш за аркушам скасаваць гэтую дамову, 448 артыкулаў якой чыняць самы гнюсны гвалт, што толькі мусілі калі-небудзь трываць нацыі і людзі. Я вярнуў Райху тэрыторыі, захопленыя ў нас у 1919 г.; я прывёў мільёны глыбока няшчасных, адрэзаных ад нас немцаў назад на радзіму; я аднавіў тысячагадовае гістарычнае адзінства жыцьцёвай прасторы немцаў; і я імкнуўся дасягнуць усяго гэтага, не праліваючы крыві і не змушаючы цярпець пакуты вайны ні мой народ, ні які іншы. Як чалавек, што 21 год таму быў яшчэ нікому не вядомым працаўнікам і салдатам свайго народу, я дасягнуў усяго гэтага маімі ўласнымі высілкамі...*

Вядома, гэта абсурд — сьцьвярджаць, што ён адзінаасобна пераламіў ход нямецкай гісторыі. Аднак уражвае, што ў гэтай літаніі неверагодных асабістых посьпехаў фюрэра — а толькі так іх магла ўспрымаць большасьць тагачасных простых немцаў — пералічваліся нацыянальныя дасягненьні, а не адлюстроўваліся асноўныя ідэі ўласнага сьветапогляду Гітлера. У гэтым пасажы — ні слова ні пра ягоную паталягічную апантанасьць «выдаленьнем» гэбраяў, ні пра неабходнасьць вайны, каб здабыць жыцьцёвую прастору. Аднаўленьне парадку, адбудова эканомікі, пераадоленьне беспрацоўя, адмена абмежаваньняў, накладзеных ненавіснай Вэрсальскай дамовай, дасягненьне нацыянальнага адзінства — усё гэта знаходзіла шырокі водгук у насельніцтва, прычым зусім ня толькі ў цьвёрдалобых нацыстаў. Фактычна гэтыя захады ў той ці іншы спосаб адпавядалі інта-

рэсам кожнага сэктару грамадзтва. Сацыялягічныя апытаньні, што праводзіліся праз шмат часу па заканчэньні Другой сусьветнай вайны, выявілі, што нават праз столькі гадоў для шмат каго гэтыя «дасягненьні» былі зьвязаныя адназначна з Гітлерам.

Тым, хто слухаў прамову Гітлера ў 1939 г., нават многім з тых, хто раней выступаў супраць нацыстаў, цяжка было не прызнаць, што ў параўнаньні з 1933 г. Гітлер дасягнуў надзвычайных посьпехаў. Мала хто меў досыць цьвярозы погляд, а таксама ахвоту, каб аналізаваць, што стаіць за гэтымі дасягненьнямі, каб сказаць «не» бесчалавечнасьці, на якой палягала аднаўленьне нямецкай эканомікі, каб заўважыць, што адбываецца разбурэньне структураў улады і руйнаваньне фінансаў Райху, і каб перадусім зразумець, да якой калясальнай пагрозы існаваньню дзяржавы вядзе палітыка нацысцкага рэжыму. І мала хто меў магчымасьць абвергнуць найвялікшую хлусьню — нібы Гітлер няспынна імкнуўся пазьбегнуць праліцьця крыві і пазбавіць свой народ (і іншыя народы) жахаў вайны. Тое, што ўвесну 1939 г. для большасьці немцаў здавалася само па сабе мэтай, з трыюмфам дасягнутай Гітлерам, для нацысцкіх лідэраў было папросту плятформай у падрыхтоўцы да расава-імпэрыялістычнай вайны.

Аднак на якім бы ілжывым падмурку ні палягалі заслугі, што прыпісваў сабе Гітлер у прамове 28 красавіка 1939 г., яны паказваюць, у якіх галінах ён дамогся значных посьпехаў, каб заваяваць падтрымку шырокіх масаў насельніцтва. Пры ўсіх неабходных абгаворках, калі робяцца абагульненьні наконт падтрымкі нацысцкага рэжыму (нязгодных пераважна змушалі маўчаць), вядома, ня будзе памылкай сказаць, што цягам мірных гадоў дыктатуры Міт пра Гітлера аб'яднаў вакол яго асобы шырокія слаі насельніцтва.

## 2. УРАДЛІВАЯ ГЛЕБА

Гэта было штучна створанае адзінства, канструкт прапаганды. А на другім баку мэдаля — перасьлед палітычных апанэнтаў, «расавых ворагаў» і іншых «чужынцаў», не прыналежных да абвешчанай «нацыянальнай супольнасьці». Асноўным пунктам гэтай ілжывай мадэлі стаўся вобраз Гітлера — «звышчалавека». Яго яшчэ да «ўзяцьця ўлады» стварыла найноўшая на той час (і надзвычай пасьпяховая) стратэгія палітычнага «маркетынгу», распрацаваная Гёбэльсам. А калі ў 1933 г. нацысты ўзялі ў свае рукі манапольны дзяржаўны кантроль над прапагандысцкай машынай, ім нішто не замінала тыражаваць праз СМІ «харызматычны» вобраз Гітлера.

Але і вытанчаная мэтодыка стварэньня Міту пра фюрэра засталася б неэфэктыўнай, калі б яшчэ задоўга да таго, як Гітлер зрабіўся райхсканцлерам, для яго не была падрыхтаваная ўрадлівая глеба. Да 1933 г. шырока распаўсюдзіліся — і ня толькі сярод прыхільнікаў нацызму — спадзевы на нацыянальнае збавеньне. Яны знайшлі ўцелясьненьне ў асобе Гітлера. На той час, як ён прыйшоў да ўлады, культ фюрэра прынамсі часова прынялі больш за 13 млн выбарцаў. А ў

шматлікіх, хоць і не зусім нязьменных, колах чальцоў партыі зь безьліччу яе нізавых арганізацыяў гэты культ прыжыўся яшчэ больш. Такім чынам склалася арганізацыйная база, каб надалей пашыраць культ фюрэра.

Урад Гітлера прыйшоў да ўлады ва ўмовах крызісу, пасьля паразы Ваймарскай рэспублікі. У такой сытуацыі было зразумела: калі новы райхсканцлер зможа хутка дамагчыся якіх-кольвек посьпехаў, ён значна павялічыць сваю папулярнасьць. Былі закладзеныя магчымасьці для хуткага росту пакланеньня Гітлеру, для заваяваньня «большасьці большасьці», што не галасавала за яго ў сакавіку 1933 г. На гэтым фоне і трэба разглядаць імклівы распаўсюд культу асобы Гітлера, беручы таксама пад увагу майстэрскае разгортваньне прапагандысцкага іміджу фюрэра.

Гітлер мог заваяваць шырокую падтрымку ў шэрагу ключавых сфэраў, дзейнічаючы, як здавалася, у агульнанацыянальных, а ня вузкіх партыйна-палітычных інтарэсах, трансфармуючы вобраз партыйнага лідэра ў нацыянальнага. Нават яго апанэнты прызнавалі рост ягонай папулярнасьці. Сацыял-дэмакратычная партыя ў выгнаньні (*Sopade*) у Празе ў красавіку 1938 г. канстатавала распаўсюджанае меркаваньне: «Гітлер можа разьлічваць на тое, што большасьць народу згодная ў двух жыцьцёва важных пунктах: 1) ён стварыў працоўныя месцы; 2) ён зрабіў Нямеччыну моцнай».

## Ахвотна прыняў ухвалу

На золку Трэцяга Райху большасьць людзей адчувала, што пасьля вусьцішных гадоў безнадзейнасьці нарэшце зьявіўся новы вэктар, новая энэргія і дынамізм, што нарэшце ўрад нешта робіць, каб узьняць Нямеччыну на ногі. Вядома, Гітлер, зь ягонымі прымітыўнымі эканамічнымі ведамі, асабіста не кіраваў адраджэньнем нацыянальнай эканомікі ў першыя гады Трэцяга Райху. Прычыны хуткага эканамічнага ўздыму былі складаныя і разнастайныя. Калі і можна назваць чалавека, які адзінаасобна склаў і зьдзейсьніў праграму эканамічнага аднаўленьня, то гэта Ялмар Шахт (Hjalmar Schacht), прэзыдэнт Райхсбанку і райхсміністар эканомікі. Унёсак Гітлера галоўным чынам быў у тым, што ён зьмяніў агульны настрой, стварыў атмасфэру ўпэўненасьці, што Нямеччына адраджаецца і ажывае. Але прапаганда выяўляла эканамічны ўздым уласным дасягненьнем Гітлера. Ён ахвотна прыняў ухвалу, і большасьць лічыла яе заслужанай.

Гэта быў першы буйны крок, каб заваяваць тых, хто не падтрымліваў яго ў 1933 г. Немагчыма было адмаўляць, што калі іншыя эўрапейскія краіны і Амэрыка ўсё яшчэ жорстка пакутавалі ад масавага беспрацоўя, то Гітлер вызваліў Нямеччыну ад гэтай навалы і абвясьціў пачатак «эканамічнага цуду». У справаздачы Сацыял-дэмакратычнай партыі ў выгнаньні з Рурскага басэйну напрыканцы лета 1934 г. прызнавалася, што нават «нэўтральныя працоўныя сілы» пераважна верылі ў Гітлера, у «стварэньне працоўных месцаў», дзякуючы чаму беспрацоўныя атрымалі працу, хоць часам і нізкааплатную. Яны верaць, што Гітлер, зь ягонай здольнасьцю «хутка прымаць рашэньні», калі яго будуць «належным чынам інфармаваць», аднойчы прыйдзе да таго, каб «зьмяніць падатко-

вую сыстэму на іхную карысьць». Вілі Брант падчас таемнага візыту ў другой палове 1936 г. у Нямеччыну з Нарвэгіі, дзе ён знаходзіўся ў выгнаньні, прызнаў тое самае: стварэньнем працоўных месцаў нацысцкі рэжым заваяваў падтрымку нават сярод тых, хто раней галасаваў за левых.

## Пакінуў трывалы сьлед

Да 1936 г. у Нямеччыне была забясьпечаная поўная занятасьць. Вядома, цяпер разьвіцьцю рынку працы задавала тон праграма пераўзбраеньня, што несла з сабой сур'ёзную пагрозу ў будучыні. Але мала каго зь немцаў турбавала, што дае ім магчымасьці ўладкавацца на працу. Для іх галоўнае было ў тым, што там, дзе ў мінулым панавала галеча, выкліканая масавым беспрацоўем, цяпер была праца. Людзі пераважна бачылі ў гэтым асабістае дасягненьне Гітлера. А калі вобраз і адрозьніваўся ад рэчаіснасьці, то пакінуў трывалы сьлед менавіта вобраз.

І праз шмат гадоў пасьля вайны многія немцы расцэньвалі тое, што Гітлер выбавіў Нямеччыну ад масавага беспрацоўя і глыбокага эканамічнага крызісу, як вялікае дасягненьне, нягледзячы на ўсе наступныя катастрофы. Паводле сацыялягічных апытаньняў, праведзеных напрыканцы 40-х гг. XX ст. у амэрыканскай акупацыйнай зоне, да заслуг Гітлера адносілі добрыя ўмовы жыцьця і поўную занятасьць. А прыкладна праз дзесяць гадоў група маладых людзей у паўночнай Нямеччыне выказвала меркаваньне, што Гітлер зрабіў шмат добрага, пераадолеўшы беспрацоўе. І нават у 70-я гг. XX ст. працоўныя Руру станоўча прыгадвалі мірныя гады Трэцяга Райху — для іх яны асацыяваліся з поўнай занятасьцю і прыемнымі экскурсіямі, што ладзіла нацысцкая арганізацыя па адпачынку «Kraft durch Freude» («Моц праз радасьць»).

Безумоўна, другі пункт, вылучаны ў красавіцкай 1938 г. справаздачы Сацыялдэмакратычнай партыі ў выгнаньні («ён зрабіў Нямеччыну моцнай») адыгрываў ключавую ролю ў пашырэньні падтрымкі Гітлера. Ён няспынна біў у званы пра прыніжэньне Нямеччыны праз паразу ў 1918 г. (вінаватыя ў ёй «лістападаўскія злачынцы») і падпісаньне ў наступным годзе Вэрсальскай дамовы. Увесь палітычны спэктар Нямеччыны быў адзіны ў нянавісьці да несправядлівай, на іх думку, дамовы. Скарачэньне войска да ста тысячаў азначала дэманстрацыю нацыянальнай слабасьці. Таму калі Гітлер ўзяўся скінуць бярэмя Вэрсальскай дамовы і вярнуць Нямеччыне яе былую моц і нацыянальны прэстыж, гэтым сьмелым замежнапалітычным крокам была гарантаваная шырокая народная падтрымка — покуль яны не вялі да праліцьця крыві.

## 3. ЖАЛЕЗНАМУ КУЛАКУ ГІТЛЕРА — ШЫРОКАЯ ПАДТРЫМКА

Выхад у 1933 г. зь Лігі Нацыяў, плебісцыт 1935 г. у Саары, вяртаньне абавязковай вайсковай службы і абвяшчэньне стварэньня новага вялікага Вэрмахту, рэмілітарызацыя Райнскай вобласьці ў 1936 г. і аншлюс Аўстрыі ў 1938 г. — усё



Гітлер наладжвае адносіны з арабскім сьветам. Муфцій Ерусаліму
на прыёме ў Гітлера. Сьнежань 1941



Простыя немцы салютуюць фюрэру (прапагандысцкае фота Г. Гофмана)



Гітлер мацуе дэмаграфічную бясьпеку (прапагандысцкае фота Г. Гофмана)



Нацыянал-сацыялістычны рытуал у публічнай прасторы



Нацыянал-сацыялістычны рытуал у публічнай прасторы




Судэцкая немка ня можа
стрымаць пачуцьцяў
пры вестцы аб далучэньні
Судэцкай вобласьці
да Трэцяга райху



Фюрэр — апора пэнсіянэраў



Дэпартацыя расава нячыстай радзіны



Чэмбэрлен і Гітлер на Мюнхэнскай канфэрэнцыі. 29 верасьня 1938



19 лістапада 1938: члены СА ў разбуранай сынагозе Мюнстэру



Нацыянал-
сацыялістычныя
хрэсьбіны



Гітлер з гурткоўцамі
гітлерюгенду

гэта ўспрымалася як трыюмфальныя нацыянальныя перамогі, што адкрыта дэманстравалі слабасьць заходніх дзяржаваў, якія пасьля Першай сусьветнай вайны прыніжалі Нямеччыну. Насельніцтва бачыла ва ўсіх гэтых дзеяньнях гераічныя ўчынкі, якія ўсяго некалькі гадоў таму немагчыма было ўявіць, зьдзейсьненыя выключна дзякуючы «генію» Гітлера як дзяржаўнага дзеяча.

Гэта мусілі прызнаць нават апазыцыйныя колы. У справаздачы Сацыял-дэмакратычнай партыі ў выгнаньні пра рэакцыю грамадзянаў на аднаўленьне абавязковага прызыву ў войска ў сакавіку 1935 г. адзначаецца:

*Калясальны ўздым 17 сакавіка. Увесь Мюнхэн выйшаў на вуліцы. Народ можна прымусіць сьпяваць, але немагчыма прымусіць сьпяваць з такім энтузіязмам. Я перажыў падзеі 1914 г. і магу толькі сказаць, што мяне менш уразіла абвяшчэньне вайны, чым тое, як 17 сакавіка прымалі Гітлера… Ён дамогся шырокай папулярнасьці ў народзе, мацнее вера ў ягоны палітычны талент і шчырую волю. Мноства людзей яго любіць.*

Судэцкі крызіс улетку 1938 г., калі як ніколі блізка навісла пагроза вайны, упершыню сур'ёзна паставіў пад пагрозу дасюль культываваны Гітлерам вобраз апантанага абаронцы правоў Нямеччыны, які вярнуў краіне прэстыж у сьвеце, калі імкнуўся пазьбегнуць праліцьця крыві. Тады, напрыканцы верасьня, у Мюнхэне заходнія дзяржавы дазволілі Гітлеру атрымаць апошнюю трыюмфальную перамогу ў замежнай палітыцы. (Праўда, у глыбіні душы яму было за яе крыўдна, бо ён прагнуў вайны супраць Чэхаславаччыны.)

## Захопніцкая вайна бязь межаў

Калі ўрэшце ў верасьні 1939 г. пачалася вайна, насельніцтва ўспрыняла яе з пакорлівасьцю, а не з уздымам. Гэта сьведчыць, што ў мірныя гады Трэцяга Райху Гітлер дамогся шырэйшай народнай падтрымкі на фальшывым падмурку. Большасьць немцаў хацела міру. Гітлер шукаў вайны. У канфідэнцыйным звароце да прадстаўнікоў нямецкае прэсы ў лістападзе 1938 г. ён фактычна прызнаваў, што трэба ўвесьці ў зман грамадзтва:

*Абставіны прымусілі мяне дзесяцігодзьдзямі гаварыць амаль выключна пра мір. Толькі ўсячасна падкрэсьліваючы імкненьне немцаў да міру і іх мірныя намеры, было магчыма даць нямецкаму народу зброю, неабходную, каб зрабіць наступны крок.*

Для пераважнай большасьці немцаў вяртаньне нацыянальнага гонару і вайсковай моцы, адмова ад Вэрсальскай дамовы і пашырэньне Райху да абсягу пражываньня этнічных немцаў — Аўстрыю і Судэты — былі канчатковымі мэтамі. Амаль ніхто ня мог ці не хацеў разумець, што для Гітлера і нацысцкіх лідэраў гэта была прэлюдыя да захопніцкай вайны бязь межаў.

Апроч уяўных заслуг ва ўмацаваньні аўтарытэту Нямеччыны ў міжнароднай

палітыцы, Гітлер, бясспрэчна, у вялікай ступені заваяваў падтрымку дзякуючы г. зв. аднаўленьню «парадку» ў самой краіне. У апошнія, крызісныя, гады Веймарскай рэспублікі нацысцкая прапаганда здолела ўвесьці ў галовы шырокіх колаў насельніцтва перабольшаныя ўяўленьні пра злачыннасьць, заняпад, бязладзьдзе ў грамадзтве і гвалт (вельмі часта правакаваныя самімі нацыстамі). Калі Гітлер прыйшоў да ўлады, яму было выгадна падтрымліваць вобраз выяўніка «народнай справядлівасьці» і «нацыянальнага здаровага пачуцьця». Ён меў публічны імідж захавальніка грамадзкай маралі, які заўсёды бязьлітасна ўдушае тых, хто нясе пагрозу правапарадку.

Напрыканцы чэрвеня 1934 г. Гітлер, на думку мноства людзей, пайшоў на жорсткія, але неабходныя захады, каб зьнішчыць кіраўніцтва СА — усё больш непапулярнага крыла ў нацысцкім руху. У выступе ў Райхстагу 13 ліпеня 1934 г. Гітлер узяў на сябе асабістую адказнасьць за забойствы. Насамрэч брутальную макіявэліеўскую палітычную змову ён паднёс як непазьбежны крок, каб зьнішчыць патэнцыйную ўнутраную пагрозу нацыі і з коранем вырваць карупцыю і амаральнасьць. Гітлер асабліва падкрэсьліваў гомасэксуалізм, амаральныя паводзіны і экстравагантны лад жыцьця Эрнста Рома і іншых лідэраў СА. Граючы на шырокараспаўсюджаных прымхах, Гітлер здолеў растаптаць усе асновапалеглыя прававыя прынцыпы — ён сьцьвярджаў, што дзейнічаў у нацыянальных інтарэсах, як найвышэйшы судзьдзя нямецкага народу.

## Рэзкі рост падтрымкі

Прызнаўшыся ў масавых забойствах, замест асуджэньня Гітлер сустрэў усеагульную ўхвалу за тое, што дзейнічаў бязь літасьці, каб зьнішчыць ліха, якое пагражала нацыі. «Сваімі энэргічнымі дзеяньнямі фюрэр заваяваў шырокія масы, асабліва тых, хто з засьцярогамі ставіўся да Руху; ім ня проста захапляюцца — зь яго робяць ідала», — сьцьвярджалася ў адной канфідэнцыйнай справаздачы, напісанай на ніжэйшых прыступках кіроўнай бюракратыі. Падобныя настроі адчуваюцца і ў шматлікіх іншых дакумэнтах.

У адной справаздачы з Баварыі гаварылася: «Увогуле, на жаль, зразумела, што людзі не разважаюць як чальцы палітычнай супольнасьці. Яны думаюць: «Цяпер, калі Гітлер навёў парадак, справа пойдзе наперад — сабатажнікі, якія хацелі яму зашкодзіць, зьнішчаныя». У дакумэнтах з Бэрліна дадаецца: «Аўтарытэт Гітлера ўмацаваўся ў самых шырокіх колах. Усё часьцей можна пачуць, як людзі кажуць: «Гітлер закручвае гайкі».

Меркаваньне, што Гітлер усталяваў у Нямеччыне парадак, захоўвалася і ў паваенны час. Нягледзячы на ягоныя «памылкі» (трэба разумець, тыя, што прывялі краіну да катастрофы, — вайну, сьмерць і зьнішчэньне мільёнаў людзей), тое, што Гітлер «ачысьціў Нямеччыну» — паклаў канец бязладзьдзю, пераадолеў злачыннасьць, дамогся, каб па вуліцах зноў было бясьпечна хадзіць уначы, узьняў маральнасьць, разам са зьнішчэньнем масавага беспрацоўя і пабудовай аўтамагістраляў — зрабілася доўгатрывалым складнікам Міту пра фюрэра.

Апроч эканамічнага ўздыму, вяртаньня вайсковай моцы і аднаўленьня «парадку», Гітлер заваяваў падтрымку тым, што стаўся ўвасабленьнем «станоўчых» якасьцяў, што зьвязваліся з нацыянальнай еднасьцю і «Volksgemeinschaft» — нацыянальнай супольнасьцю. Прапагандысцкая машына няспынна выяўляла яго суворым, але справядлівым «бацькам сям'і», гатовым адмовіцца ад звычайных чалавечых радасьцяў і працаваць дзень і ноч дзеля адзінай мэты — дабра свайго народу. Як бы часта ні крытыкавалі ягоных падначаленых, які б ні быў адмоўны імідж «маленькіх гітлераў» — партыйных функцыянэраў, зь якімі штодня сутыкаліся людзі, неаднойчы заўважаючы іх неадпаведнасьць пасадам, — самаго Гітлера шырокія масы ўспрымалі як асобу, што стаіць вышэй за групавыя інтарэсы і матэрыяльныя выгоды. Ягоная асабістая бескарысьлівасьць супрацьпастаўлялася сквапнасьці і карумпаванасьці партыйных «шышак».

Рытуальныя хваласьпевы «нашаму Гітлеру», якія штогод да дня народзінаў фюрэра друкаваў Гёбэльс, папулярныя фотаальбомы, выдаваныя Гайнрыхам Гофманам (кожны прадаваўся велізарным накладам), у якіх нібыта раскрываўся партрэт «неафіцыйнага» Гітлера: «Гітлер, якога ніхто ня ведае» (1932), «Моладзь вакол Гітлера» (1934), «Гітлер у сваіх гарах» (1935) і «Гітлер у вольны час» (1937) — усё гэта мела на мэце падкрэсьліць «чалавечае» ў асобе фюрэра і паказаць, што ягоныя «гераічныя» якасьці вынікаюць з таго, што ён — «чалавек з народу».

## 4. «АКТЫЎНАЯ НЯНАВІСЬЦЬ ДА МЕНШАСЬЦЯЎ»

Вядома, ніколі ня ўдасца высьветліць, колькі чалавек цалкам падпала пад абрыдлівы культ асобы Гітлера. Але, відавочна, іх было нямала. Яму ракой цяклі лісьлівыя лісты, графаманскія вершы, іншыя славаслоўі, фатаграфіі і падарункі (аднойчы нехта прапанаваў мех бульбы, якую любіў фюрэр) — усім гэтым займаліся ягоныя ад'ютанты. У першыя гады Трэцяга Райху больш і больш бацькоў давалі сваім немаўлятам імя Адольф, хоць паводле ўказу ад 1933 г. супрацоўнікаў мясцовых органаў рэгістрацыі інструктавалі адахвочваць ад гэтага бацькоў, каб берагчы імя фюрэра. Бясспрэчна, падобныя праявы культу фюрэра пераважна не выходзілі за межы кола фанатычных нацыстаў, якія складалі меншасьць. Але нават тыя, хто здолеў дыстанцыявацца ад буйнамаштабнага культу асобы, часьцяком прызнавалі прынамсі некаторыя станоўчыя рысы ў вобразе Гітлера.

Самое вызначэньне нацыянальнай супольнасьці сфармавалася праз супрацьпастаўленьне тым, хто зь яе выключаўся. Таму ў яе асэнсаваньне нацыстамі непазьбежна неад'емным складнікам улучалася расавая дыскрымінацыя. Захады па забясьпечаньні «расавай чысьціні» (перасьлед гомасэксуалістаў, цыганоў і «антысацыяльных элемэнтаў») эксплюатавалі наяўныя ў грамадзтве забабоны і, меркавалася, мелі на мэце ўмацаваць аднародную этнічную нацыю. Такім чынам, яны падтрымлівалі вобраз Гітлера як увасабленьня нацыянальнай супольнасьці. Больш за тое, бязьлітаснае выкрыцьцё магутных «ворагаў нацыі»: баль-

шавізму, заходняй «плютакратыі» і перадусім гэбраяў (прапагандысцкая машына зьвязвала іх і з бальшавікамі, і з «плютакратамі») — умацоўвала станоўчы імідж Гітлера як абаронцы нацыі, бастыёну, які аберагае яе ад небясьпекаў — вонкавых і унутраных, — што пагражаюць яе выжываньню.

Пераважная частка насельніцтва не падзяляла антысэміцкай параноі Гітлера. Аднак тая, відавочна, не пераважвала станоўчых рысаў, якія бачыла ў Гітлеру большасьць. Яшчэ раней, чым манапольная нацысцкая прапаганда ўзялася насаджаць нянавісьць да гэбраяў, у грамадстве была пашыраная прыхаваная няпрыязь да іх. Таму і не сустрэла ніякага супраціву «актыўная» нянавісьць да гэбраяў з боку досыць шматлікай меншасьці — праўда, меншасьці, якой з 1933 г. належала ўлада. Ёсьць багата досьледаў, што ілюструюць, як па-featрознаму ставілася насельніцтва да перасьледу гэбраяў (найбольш яскрава гэта выявілася ў рэакцыі на абвяшчэньне Нюрнбэрскіх законаў у верасьні 1935 г. і «Крышталёвую ноч» (Kristallnacht) у лістападзе 1938 г.). Аднак нацысты здолелі пераканаць большасьць, што «гэбрайскае пытаньне» сапраўды існуе, і абвастрыць антыгэбрайскія настроі, калі ўзрастала вонкавая пагроза вайны.

## Дробязь

Калі выявілася, што адкрыты гвалт падчас *Kristallnacht* не падтрымалі нават у нацысцкіх колах, Гітлер паклапаціўся пра тое, каб публічна дыстанцыявацца ад пагрому, які ж сам і замовіў. Аднак, нягледзячы на шырокае непрыманьне гвалтоўных мэтадаў, у грамадстве на той час панавала адчуваньне, што гэбраям у Нямеччыне больш няма месца. Калі Гітлер зьвязваў гэбраяў з ростам міжнароднай небясьпекі (а дзеля яе павелічэньня сам ён зрабіў больш, чым хто іншы), гэта ўмацоўвала — прынамсі, не аслабляла — ягоны імідж апантанага абаронцы нацыянальных інтарэсаў.

Шмат хто выйграў і матэрыяльна ад выключэньня гэбраяў зь нямецкага грамадства, пазбаўленьня іх права ўласнасьці і выгнаньня з краіны. У выніку «байкоту», распачатага, як толькі Гітлер зрабіўся райсхканцлерам, гэбраяў урэшце пасьпяхова выціснулі з камэрцыйнага жыцьця. Так была падрыхтаваная глеба для праграмы «арыйскай расы» 1938 г., якая пазбавіла гэбраяў іх маёмасьці, але прынесла выгаду мноству немцаў. І тут шмат хто меў падставы быць удзячным фюрэру. Чалавечыя ахвяры з боку непапулярнай меншасьці для такіх людзей былі проста ня вартай увагі дробязьзю.

Бясконцыя посьпехі, што мог прыпісваць сабе Гітлер у «мірныя» гады Трэцяга Райху, мелі яшчэ адзін дадатковы вынік. Пасьля 1933 г. філіі НСДАП ахапілі сваім сецівам ледзь ня кожны сэктар грамадзтва. Нацысцкі рух так ці іначай «арганізаваў» мільёны немцаў, і ва ўсіх філіях цяжка было ўнікнуць ліпучых абдымкаў культу фюрэра. Армія дробных апаратчыкаў і кар’ерыстаў была абавязаная сваімі пасадамі і прасоўваньнем па службовай лесьвіцы «сыстэме» на чале з Гітлерам. Рабіўся акцэнт на «лідэрства», «дасягненьні», што заахвочвала да жорсткай канкурэнцыі, граючы на чалавечых амбіцыях, адкрывала нечуваныя магчымасьці і накіроўвала магутны паток энэргіі ў рэчышча, дзе ўсе імкнуліся




Кніга Гітлера «Майн кампф» вытрымала некалькі соцень перавыданьняў.



Гітлер на публічным сходзе.



Гітлер на парадзе.



Палітычны папуліст.



Нацысцкі парад.

прасоўваць ідэю нацыянальнагааднаўленьня, увасобленую ў Гітлеру. Шмат хто на ўсіх узроўнях улады ў літаральным ці мэтафарычным сэнсе дзейнічаў адпаведна прынцыпам, выкладзеным у лютым 1934 г. дзяржаўным сакратаром Міністэрства сельскай гаспадаркі Прусіі Вэрнэрам Вілікенсам:

*Кожны, хто можа назіраць, ведае, што фюрэр ня ў стане дыктаваць зь вяршыні ўлады ўсё, чаго ён мае намер дасягнуць у канчатковым выніку. Наадварот, на цяперашні час кожны, хто займае ў новай Нямеччыне якую-небудзь пасаду, найлепш працуе, калі, так бы мовіць, дзейнічае дзеля фюрэра і ў духу фюрэра.*

Вілікенс дадае, што «абавязак кожнага — імкнуцца дзейнічаць дзеля фюрэра і ў духу фюрэра». У гэтых словах — ключ да разуменьня, як функцыянаваў Трэці Райх і як фармавалася повязь Гітлера з грамадзтвам.

## Дэмаралізаваныя і ізаляваныя

Вядома, што гэтая повязь не заўсёды і ня ўсюды была аднолькава моцнай. Побач з фанатыкамі заставаліся і скептыкі, дысыдэнты, хоць і пазбаўленыя рэальнай магчымасьці выказваць свае думкі. Захапленьне фюрэрам таксама не ўдавалася падтрымліваць на аднолькава высокім узроўні. Пікі прыходзіліся на моманты трыюмфу, як, напрыклад, абвяшчэньне рэмілітарызацыі Райну ў 1936 г. Але яны спадалі, як толькі большасьць людзей вярталася да шэрай будзённасьці.

Тым ня менш, эмацыйная лучнасьць, створаная ўзьлётам папулярнасьці Гітлера ў першыя гады дыктатуры, адыгрывала невымерна важную ролю. Шчырае ці штучнае, услаўленьне фюрэра служыла адной і той жа мэце. Мільёны немцаў, якія маглі б выступаць супраць рэжыму, сумняваліся ці толькі трохі прымаць нацысцкую дактрыну, мусілі публічна, на вачох у мільёнаў іншых, выказваць падтрымку Гітлеру. Для нацысцкай улады гэта мела ключавое значэньне.

Распаўсюд культу фюрэра да найніжэйшага ўзроўню азначаў, што сам Гітлер можа дыстанцыявацца ад палітычных праблемаў, якія не дадавалі яму папулярнасьці, і практычна як заўгодна выкарыстоўваць калясальныя рэзэрвы асабістай падтрымкі. Напрыклад, адмоўная рэакцыя, выкліканая «барацьбой з царквой», скіроўвалася не на Гітлера, а на ягоных падначаленых — Гёбэльса і Розэнбэрга.

Калі ўвесну 1936 г. народны энтузіязм упаў, каб узьняць яго зноў, рэжым разыграў эфэктны райнскі сцэнар. «Выбары» ў Райхстаг 29 сакавіка 1936 г. арганізоўваліся з адной мэтай — прадэманстраваць усім і ў самой краіне, і за мяжой адзінства народу, які ідзе за Гітлерам. Апанэнты рэжыму — далёка не апошні раз за часам Трэцяга Райху — адчулі, што яны дэмаралізаваныя і ізаляваныя ад грамадзтва. А Гітлер дамогся народнай падтрымкі, неабходнай, каб ажыцьцяўляць свае экспансіяніскія мэты. «Фюрэр дазваляе народу патрабаваць, каб ён праводзіў тую палітыку, якую хоча», — трапна заўважалася ў адной справаздачы Сацыял-дэмакратычнай партыі ў выгнаньні.

### Зрынуць яго немагчыма

Усенароднае ўхваленьне, якое мог выклікаць Гітлер у падобных выпадках, істотна ўмацавала ягоную пазыцыю сярод розных груповак уладнай эліты. Празь велізарную папулярнасьць фюрэра ніхто ў вузкіх колах нацысцкіх лідэраў ня мог аспрэчыць ягоных дагматычных поглядаў і ягонай палітыкі, нават калі ў 1938—1939 гг. некаторыя зь іх, у т. л. Гёрынг, хацелі б адступіць, зразумеўшы, якую небясьпеку нясе вайна з заходнімі дзяржавамі. Што яшчэ больш істотна, дзякуючы сваёй папулярнасьці Гітлер стаўся недатыкальным для тых нацыянал-кансэрватыўных уладных груповак (найперш у Вэрмахце і часткова ў Міністэрстве замежных справаў), у якіх праз страх перад будучай ваеннай катастрофай да 1938 г. пачалі складвацца зародкі апазыцыі, што не падзяляла небясьпечнага замежнапалітычнага курсу. Калі заходнія дзяржавы чарговы раз згулялі на руку Гітлеру — дазволілі яму яшчэ адзін «трыюмф без праліцьця крыві», напрыканцы верасьня 1938 г. нованароджаныя апазыцыйныя сілы яскрава ўбачылі: зрынуць яго немагчыма. (Гэтае разуменьне спрычынілася да таго, што падчас першай, пераможнай, фазы вайны быў спаралюшаваны ўсялякі супраціў Гітлеру з боку кансэрватыўнага крыла.)

## ФАТАЛЬНЫ НАРЦЫСІЗМ

Тое, што Гітлер заваяваў масы, мела адно жыцьцёва важнае наступства: ягоная ўлада вызвалілася ад усіх магчымых стрымак з боку іншых складнікаў рэжыму. У выніку ўсе ідэі-фікс, якія апаноўвалі Гітлера ад пачатку ягонай палітычнай кар’еры: «выдаленьне» гэбраяў і пашырэньне «жыцьцёвай прасторы» — да канца 30-х гг. XX ст. сталіся ня проста аддаленымі ўтапічнымі марамі, а дасяжнымі палітычнымі мэтамі. Яны прасоўваліся на ўсіх узроўнях улады — эксплюатавалася гатоўнасьць «працаваць дзеля фюрэра». Але ва ўсім гэтым выразна адлюстроўвалася вяршэнства Гітлера, якое ён так хутка ўсталяваў па прыходзе да ўлады.

Урэшце пашырэньне культу фюрэра паўплывала і на самаго Гітлера. Некаторыя асобы зь ягонага найбліжэйшага атачэньня потым сьцьвярджалі, што прыкладна ў 1935—1936 гг. заўважылі ў Гітлеру пэўныя зьмены. Ён яшчэ больш, чым раней, не трываў нават найменшай крытыкі, яшчэ больш упэўніўся ва ўласнай беспамылковасьці. У ягоных прамовах больш выразна загучалі мэсіянскія ноткі. Ён усё больш і больш бачыў сябе абранцам лёсу. У адной са сваіх «перадвыбарных» прамоваў пасьля пасьпяховага ўстанаўленьня кантролю над Райнскай вобласьцю Гітлер заўважыў: «Я іду шляхам, прызначаным мне лёсам, з інстынктыўнай пэўнасьцю самнамбулы». І гэта была ня проста прапагандысцкая рыторыка — ён шчыра ў гэта верыў. Гітлер усё больш адчуваў сябе бясхібным.

Не пазьней як у сярэдзіне трыццатых нарцысічныя рысы ягонай асобы ў спалучэньні зь бязьмежнай лісьлівасьцю, падлізваньнем і бясконцым услаўленьнем з боку народных масаў умацавалі Гітлера ў веры, што лёс Нямеччыны знаходзіц-

ца ў ягоных руках і толькі ён адзін зможа прывесьці краіну да кончай перамогі ў вялікай вайне, якая насоўвалася бліжэй і бліжэй. «Усё залежыць па сутнасьці ад мяне, майго жыцьця, майго палітычнага майстэрства», — казаў ён генэралам напярэдадні вайны. Гітлер у якасьці аргумэнта падкрэсьліваў, што «ніхто іншы ніколі ня будзе карыстацца такім даверам усяго нямецкага народу, як я. Ніколі ў будучыні ня зьявіцца чалавек, які б меў большую ўладу, чым я. Таму маё жыцьцё — велізарная перавага… Нікому не вядома, колькі я яшчэ пражыву. А значыць, лепш распачаць канфлікт цяпер».

На той час — а было гэта ў жніўні 1939 г. — усе структуры рэжыму, а таксама народныя масы, што так радаваліся кожнаму «посьпеху» Гітлера, надзейна прывязалі свой лёс да рашэньняў фюрэра. Так будзе да 1945 г. У гады вайны, калі «слаўная перамога» абярнулася нарастальнай, няўмольнай катастрофай, калі паразы адна за другой непазьбежна размывалі падмурак ягонай харызмы як правадыра нацыі, калі зрабілася зразумела, што Гітлер вядзе краіну ў бездань, створаная ў «добрыя» трыццатыя повязь з Гітлерам адрэзала ўсялякі шлях назад. Падтрымаўшы Гітлера ў часе ягонага трыюмфу, немцы цяпер былі асуджаныя перажыць катастрофу, да якой іх давёў іхны фюрэр.

*Пераклала з ангельскай мовы зь нязначнымі скарачэньнямі Т. П. паводле* Spiegel Online International, *30 студзеня 2008 г. (http://www.spiegel.de/international/germany/0,1518,531909,00.html)*




Нацысцкі антысэміцкі плякат. 1930




Нацысцкі плякат. Травень 1941




Нацыянал-сацыялізм, як і сталінская дыктатура, успрымаў ЗША як аплот маральнай распусты і згубных уплываў







Выбарчыя плякаты нацыянал-сацыялістаў канца 1920 г. заклікалі змагацца з карупцыяй да пераможнага канца і разарваць путы міжнароднай плютакратыі

ПЭР РАДЛІНГ

# Вялікая Айчынная вайна ў свядомасці беларусаў

Вайна 1941—1945 гг. паміж нацысцкай Германіяй і Савецкім Саюзам сталася самым маштабным узброеным канфліктам у гісторыі чалавецтва. Паводле падлікаў гісторыкаў, агульная колькасць ахвяраў з савецкага боку склала да 40 мільёнаў чалавек, што ўдвая больш, чым было афіцыйна абвешчана савецкай уладай[1]. Расійцы, беларусы і ўкраінцы панеслі непараўнальна большыя людскія ахвяры, чым іншыя народы Савецкага Саюза. Паводле апошніх падлікаў, Беларуская ССР згубіла трацiну свайго насельніцтва[2]. На момант пачатку вайны насельніцтва рэспублікі складала 9,2 мільёна чалавек. У 1945 г. яно скарацілася да 6,3 мільёна. Гэта без уліку ахвяраў палітычнага тэрору 1930-х гг., які закрануў да 500 000 чалавек толькі ў перыяд да 1939 г. З увагі на тое, што перад далучэннем Заходняй Беларусі да БССР насельніцтва апошняй складала каля пяці мільёнаў, рэпрэсаваны быў кожны дзесяты жыхар рэспублікі[3]. Пры гэтым у 1930-я гг. загінула каля 90 адсоткаў беларускай інтэлігенцыі[4].

## ЭТНІЧНЫ ТЭРОР

Другая сусветная вайна завяршыла працэс гвалтоўных зменаў, распачаты ў 1930-я гг. Са зменай палітычнай кан'юнктуры ў Савецкім Саюзе і пераходам ад класавай барацьбы да сацыяльнага замірэння ўлады надалі класавым ворагам этнічнае аблічча. Калі ў 1920-я гг. кіраўнікі БССР адмыслова стрымлівалі антыпольскія настроі, дык ужо ў 1930-я прадстаўнікоў дзевяці нацыянальнасцяў, ся-

***Пэр Андэрс Радлінг*** *— выкладчык гісторыі ўнівэрсытэту Альбэрты (Канада). Доктар філязофіі названага ўнівэрсытэту (2007). У сфэру яго навуковых інтарэсаў уваходзяць калектыўныя ідэнтычнасьці, нацыяналізм і гісторыя іміграцыі. У апублікаваным перакладзе былі моцна скарочаныя спасылкі.*

род якіх апынуліся й палякі, аднеслі да ворагаў савецкай дзяржавы. Менавіта яны панеслі найвялікшыя страты падчас рэпрэсіяў[5]. У 1930-я гг. савецкія СМІ навешвалі ярлыкі на цэлыя этнічныя групы. Палякаў, напрыклад, таўравалі як «паноў», а фінаў — як «белых самураяў». Першыя былі агулам залічаныя да класавых ворагаў і караліся паводле нацыянальнай прыналежнасці. Папулярная прыказка «раз поляк, значит кулак» выяўляла сутнасць Вялікага тэрору 1937—1938 гг., калі шараговы паляк меў у 30,92 раза больш шанцаў трапіць у турму, чым непаляк[6]. Колькасць этнічных палякаў у БССР зменшылася з 119 900 да 58 400 у перыяд з 1937 да 1939 гг.[7].

Такім чынам, калі Германія напала на Савецкі Саюз, Беларусь ужо мела досвед палітычнага гвалту. Пакт Молатава — Рыбентропа, падпісаны ў 1939 г., не толькі прывёў да аб’яднання Беларусі, але й спрычыніўся да новай хвалі рэпрэсіяў.

На вялікае расчараванне кіраўніцтва БССР, было прынятае рашэнне перадаць Вільню Літоўскай ССР, што назаўсёды пахавала ідэю аднаўлення беларус-

[1] У савецкай гістарыяграфіі афіцыйная колькасць ахвяраў вайны з боку СССР увесь час узрастала. Так, да смерці Сталіна лічылася, што ў вайне загінула ад 7 да 8 мільёнаў савецкіх грамадзян. Пасля 1953 г. абвясцілі лічбу 17 мільёнаў. У 1961 г. Хрушчоў заявіў пра 20 мільёнаў забітых. Апошняя лічба лічылася афіцыйнай у час Хрушчова і Брэжнева. [Колькасць ахвяраў расла па меры аддаленяя ад падзеяў. Гарбачоў пазней заявіў пра 27 мільёнаў забітых. — **Рэд. перакладу.**]

[2] Хрысціян Герлах падлічыў, што падчас вайны загінула ад 1,6 да 1,7 мільёна насельнікаў БССР з агульнай колькасці насельніцтва 9 мільёнаў, з якіх: 700 000 палонных, ад 500 000 да 550 000 яўрэяў, 345 000 ахвяраў гэтак званых супрацьпартызанскіх аперацыяў і 100 000 прадстаўнікоў іншых этнічных групаў. Сюды неабходна дадаць ад 550 000 да 600 000 жыхароў БССР, што загінулі на фронце. Агульная колькасць ахвяраў, такім чынам, складае ад 2,3 да 2,4 мільёна чалавек. Christian Gerlach, Kalkulierte Morde: Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. Hamburg: Hamburger Edition, 1999. P. 1158—1159. [Звяртае ўвагу тое, што пры падобным падліку палонныя, якія не ўваходзілі ў склад насельніцтва Беларусі, улічваюцца як насельнікі, што прыводзіць да двайнога падліку — на тэрыторыі іх нараджэння і на тэрыторыі іх гібелі. — **Рэд. перакладу.**]

[3] Дзярновіч Алег. Рэабілітацыя: Зборнік дакументаў і нарматыўных актаў па рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 1920—1980-х гадоў у Беларусі. — Менск: Атэнэум, Калекцыя «Архіў Найноўшае Гісторыі», 2001. С. 17.

[4] Платонаў Р. П. і. Коршук У. К (рэд.) Беларусізацыя ў 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы. — Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2001. С. 24.

[5] Radzik Ryszard. Białorusini i Polacy. Świadomość społeczna mieszkańców Białorusi w XX stuleciu // Mironowicz Eugeniusz, Tokć Siarhiej i Radzik Ryszard. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku. Białystok: Wydawniñtwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. S. 149—171.

[6] Martin Terry. The Affirmative Action Empire: Nations and Nationalism in the Soviet Union 1923—1939. Ithaca and London: Cornell University Press, 2001. P. 321.

[7] Польскі С. А. (рэд.) Беларусы: Этнагеаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі: атлас. — Мінск: Камітэт дзяржаўных знакаў пры Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь, 1996. С. 6.

ка-літоўскай дзяржавы. Вільня, якая доўгі час была інтэлектуальнай і духоўнай сталіцай беларускага нацыяналізму, была назаўсёды адарваная ад БССР. Перыяд з 1939 да 1941 гг. прынёс незлічоныя бедствы жыхарам Заходняй Беларусі, хоць вайсковая кампанія верасня 1939 г. не была крывавай. Жыхары Заходняй Беларусі нападалі на польскіх жаўнераў, якія адступалі, і сустракалі Чырвоную Армію кветкамі, хлебам-соллю ды хутка будавалі помнікі «вызваліцелям». Аднак калі ў 1938—1940 гг., падчас гэтак званай «Берыевай адлігі», рэпрэсіі ў «старых» рэспубліках СССР запаволіліся, асноўны цяжар палітычнага тэрору панеслі нядаўна анексаваныя тэрыторыі[8].

Нягледзячы на тое, што этнічныя палякі былі аб'ектам беспрэцэдэнтнага пераследу цягам 1937—1941 гг., да пачатку вайны Беларусь заставалася шматэтнічнай і шматмоўнай рэспублікай са значнымі меншасцямі, для якіх роднымі мовамі былі польская і ідыш. Аднак вайна змяніла дэмаграфічны склад БССР.

Ад 1939 да 1941 гг. савецкая ўлада рэпрэсавала амаль 500 000 палякаў, што жылі на тэрыторыі былой усходняй Польшчы. Гэтыя чысткі таксама мелі этнічны характар, бо скіраваныя яны былі пераважна супраць палякаў і яўрэяў. Нават нягледзячы на тое, што больш за 400 000 палякаў перажылі рэпрэсіі[9], мала хто з іх вярнуўся ў БССР ці Савецкую Украіну, бо пасля вайны этнічных палякаў высялялі ў камуністычную Польшчу[10]. У 1939—1941 гг. у межах былой усходняй Польшчы НКВД арыштаваў больш людзей, чым ва ўсім астатнім СССР[11].

На гэтых землях камуністы сістэматычна вынішчылі прадстаўнікоў былой, збольшага польскай, эліты. Іх месца занялі беларусы, расійцы ці яўрэі. Праблема антысемітызму, які ў Польшчы быў узведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі і набыў асабліва жорсткія формы пасля смерці Пілсудскага ў 1935 г., знікла. З усталяваннем савецкай улады ў 1939 г. яўрэям дазволілі займаць адказныя пасады, што было немагчыма ў польскай дзяржаве часу санацыі. Надыход сталінскага тэрору супаў на тэрыторыі былой усходняй Польшчы з павелічэннем ролі яўрэяў у кіраванні дзяржавай. На пасады, з якіх звальнялі палякаў, часцяком прызначалі яўрэяў, якіх, адрозна ад палякаў, украінцаў ці беларусаў, немагчыма было падазраваць у прыхаваным нацыяналізме.

Так склаўся стэрэатып жыдакамуны ці юдэакамунізму: вера ў тое, што камунізм — гэта яўрэйская змова. Камуністычны гвалт і тэрор у меншай ступені адбіліся на беларусах. Шмат хто з іх, найбяднейшых і самых бяспраўных жыхароў былых польскіх крэсаў, нават выйграў ад шэрагу захадаў савецкай улады — такіх, як, напрыклад, пераразмеркаванне зямлі. З прычыны татальнай непісьменнасці і

[8] Snyder Timothy. Sketches From a Secret War: A Polish Artist's Mission to Liberate Soviet Ukraine. New Haven: Yale University Press, 2005. P. 177.

[9] Тамсама. P. 177.

[10] Ад 1944 да 1947 г. 1 481 000 польскіх грамадзянаў, у тым ліку 200 000 яўрэяў, пакінулі Савецкі Саюз. Magosci Paul Robert. Historical Atlas of East Central Europe. Toronto: University of Toronto Press, 1993. P. 167.

[11] Snyder Timothy. Sketches… P. 177.

адноснай сацыяльна-эканамічнай адсталасці ўзровень палітычнай свядомасці ў Заходняй Беларусі заставаўся нізкі.

## НАЦЫСЦКАЯ АКУПАЦЫЯ

Напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз стаўся для Беларусі трагедыяй каласальнага маштабу. Гэтая вайна мела асаблівую сутнасць, бо нямецкае камандаванне апісвала яе як «rassenideologische Vernichtungskrieg» («расава-ідэалагічную вайну на вынішчэнне») у адрозненне ад «europäischer Normalkrieg» («звычайнай еўрапейскай вайны»), што мела на ўвазе намер фашыстаў вынішчыць зваяваныя народы[12]. Вайна з СССР планавалася як каланіяльная, яе мэтай мусіла стаць расчышчэнне «жыццёвай прасторы» для германцаў. Найбольшай ахвярай нацысцкай палітыкі стала Беларусь.

Расійска-ізраільскі гісторык Дэніел Раманоўскі цвердзіць, што дзесяцігоддзе таталітарнага сталінскага тэрору прытупіла чуйнасць людзей, якія прызвычаіліся да масавых забойстваў. У выніку нацысты сутыкнуліся з грамадствам, пазбаўленым эмоцыяў:

*Справа была не толькі ў антысеміцкіх настроях. Насельнікі гарадоў і вёсак у Беларусі, Расіі і Украіне не ненавідзелі яўрэяў, а проста ставіліся да іх абыякава. Жыццё і смерць незнаёмага чалавека, асабліва прадстаўніка іншага этнасу, іх не хвалявала*[13].

Пры гэтым беларусы аказалі жорсткі супраціў нямецкім захопнікам. Сутыкнуўшыся з ворагам, які абвяшчае сваёй мэтай татальнае вынішчэнне цэлых нацыяў, аднымі з першых узяліся за зброю віленскія яўрэі, але партызаны іншых нацыянальнасцяў і савецкае кіраўніцтва прымусілі іх спыніць барацьбу. Часам ад іх наўпрост адварочваліся і нават выдавалі немцам прасавецкія партызаны-беларусы, але асабліва часта гэта рабілі палякі[14].

Дачыненні паміж яўрэямі і неяўрэямі мелі ў Беларусі свае асаблівасці. У той час, калі пра суіснаванне ўкраінцаў і яўрэяў казалі як пра «дзве адзіноты», характар беларуска-яўрэйскіх кантактаў быў іншы. Даследчыкі згаджаюцца, што нават пасля абвастрэння антысеміцкіх настрояў, па савецкай і нямецкай акупа-

[12] Hillgruber Andreas. Deutschlands Rolle in der Vorgeschichte der beiden Weltkriege. Göttingen, 1967. P. 219. Mylliniemi Seppo. Die Neuordnung der Baltischen Länder 1941—1945: Zum nationalsozialistischen Inhalt der deutschen Besatzungspolitik. Helsinki: Vammalan Kirjapaino OY, 1973. S. 46.

[13] Romanovsky Daniel. Soviet Jews under Nazi Occupation in Northeastern Belarus and Western Russia. P. 241.

[14] Kaganovitsh Moyshe. Di yidishe froy in partizanke // Turkoi Moyshe (ed.). Dos poilishe yidntum: bikherserie. Vol. 125. Buenos Aires: Tsentral-farband fun poylishe yidn in Argentine, 1956. P. 216—246.

цыях, антысемітызм быў менш уласцівы Беларусі, чым суседнім краінам[15]. Памяркоўнасць антысемітызму ў Беларусі тлумачыцца й агульнай слабасцю нацыяналістычных настрояў і этнанацыянальнага руху. У той час, калі антысемітызм стаў неад'емнай часткай украінскага, польскага і расійскага нацыяналізму, для кожнага з якіх яўрэі ўвасаблялі «варожага іншага», у беларускай нацыянальнай ідэі антыяўрэйскія настроі адсутнічалі. І хаця некаторыя прадстаўнікі беларускай нацыянальнай эліты агучвалі антысеміцкія ідэі, яны не мелі ўплыву на шараговых беларусаў у час вайны[16].

У афіцыйным ліставанні прадстаўнікі нямецкай акупацыйнай улады скардзіліся, што мясцовае насельніцтва ў Беларусі цяжка падштурхнуць да гвалту супраць юдэяў і што беларусы «не разумеюць расавай небяспекі, якая зыходзіць ад яўрэяў»[17]. Сяляне часцяком хадзілі на масавыя забойствы яўрэяў як на шоў, для іх гэта была «магчымасць пазабавіцца». Аднак мясцовыя жыхары па-рознаму ставіліся да Халакосту, і шмат хто быў шакаваны жудасным вынішчэннем яўрэяў. Марцін Дын апісвае рэакцыю беларусаў у Барысаве падчас карнай аперацыі супраць мясцовых яўрэяў, якую ў кастрычніку 1941 г. праводзіла Einsatzgruppe B. Калі ў горадзе збіралі яўрэяў, што адбывалася на вачах усіх насельнікаў места, сёй-той з мясцовых жыхароў не хаваў варажнечы і казаў немцам: «Забіце іх, яны нас папамучылі». Аднак настроі мясцовых жыхароў змяніліся, калі яны зведалі на сабе нямецкі перaслед і ўсвядомілі, што фашысты маюць намер вынішчыць усіх яўрэяў у акрузе.

*Калі ўвечары людзі верылі, што некаторыя яўрэі заслугоўваюць смерці, на наступны дзень яны ўжо думалі сабе: як гэта так? За раз забіць 6500 яўрэяў? Калі сёння нішчаць яўрэяў, дык заўтра, пэўна, чарга дойдзе да нас*[18].

Нягледзячы на пэўныя праблемы ў беларуска-яўрэйскіх дачыненнях да вайны, яны заставаліся «нармальнымі» ці нават цёплымі ў параўнанні з тым, што дзеялася ў суседніх рэспубліках. Шмат хто з яўрэяў, якія выжылі ў Мінскім гета, захавалі добрыя пачуцці да беларусаў. У сваіх успамінах пра Халакост яны асабліва падкрэслівалі ўдзячнасць беларусам і расійцам, якія рабілі ўсё магчымае, каб выратаваць іх жыцці[19]. Моцнае пачуццё міжэтнічнай еднасці, якое распаўсюджвалася і на яўрэяў, прынамсі часткова тлума-

[15] Cholakowski Shalom. The Holocaust and the Armed Struggle in Belorussia as Reflected in Soviet Literature and Works by Émigrés in the West. P. 226 // Gitelman Zvi (ed.) Bitter Legacy: Confronting the Holocaust in the USSR. Bloomington and Indianapolis: Indiana University Press, 1997.

[16] Напрыклад, будучы прэзідэнт БНР Мікола Абрамчык падзяляў погляды ўкраінскіх і польскіх нацыяналістаў што да жыдакамуны і атаясамліваў бальшавізм з яўрэйскай змовай.

[17] Epstein Barbara. Allies in Resistance: Jews and Belarussians in German-Occupied Minsk. P. 453.

[18] Dean Martin. Collaboration in the Holocaust: Crimes of the Local Police in Belorussia and Ukraine, 1941—1944, New York: St. Martin's Press, 2000. P. 52.

[19] Epstein… P. 439, 454—457.

чыцца прыняццем савецкай ідэалогіі жыхарамі БССР. Такім чынам, лепш угрунтаваныя прасавецкія настроі азначалі большую салідарнасць з яўрэямі, у той час, калі дапамога яўрэям з боку тых, хто варожа ставіўся да савецкай улады, была адчувальна меншай[20].

## ПАРТЫЗАНКА ПАВОДЛЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПРЫКМЕТЫ

Нягледзячы на прасавецкія настроі беларускага яўрэйства, роля яўрэйскага супраціву падчас вайны свядома замоўчвалася камуністычным рэжымам, асабліва пасля кампаніі «супраць касмапалітызму» ў 1948—1953 гг. і заснавання дзяржавы Ізраіль[21].

Акрамя добра вядомай савецкай партызанкі, у Беларусі, асабліва ў заходніх раёнах, дзейнічалі групы нямецкіх калабарантаў і нацыяналістычныя вайсковыя фармаванні. Больш за тое, прадстаўнікі этнічных меншасцяў стваралі на тэрыторыі Беларусі свае партызанскія атрады — яўрэйскія, польскія і ўкраінскія.

Украінская паўстанцкая армія і байцы польскай Арміі Краёвай актыўна дзейнічалі ў Беларусі, найперш супраць савецкіх войскаў, але былі й аперацыі супраць мясцовых яўрэяў і немцаў[22]. У той самы час цэнтральнае месца ў савецкай гістарычнай міфалогіі займала партызанка, якая захіляла ўсе іншыя формы супраціву, што не ўпісваліся ў межы камуністычнай догмы. Напрыклад, абмежаваная інфармацыя пра дзейнасць УПА мела выключна негатыўны характар. Сведчанні пра яўрэйскі супраціў хутка зніклі з афіцыйнага ваеннага наратыву пасля сталінскай кампаніі супраць касмапалітызму праз некалькі гадоў па заканчэнні вайны. Доўгі час ігнараваны, гэты феномен толькі нядаўна атрымаў увагу замежных даследчыкаў. Аднак адносіны яўрэйскай і неяўрэйскай партызанкі дагэтуль застаюцца малавядомымі.

[20] «Людзі, якія прыхільна ставіліся да савецкай улады, спачувалі і дапамагалі яўрэям, але абураліся, калі бачылі, што яўрэі пакорліва даюць сябе забіць, не робячы аніякіх спробаў бунтавацца ці масава сыходзіць у партызаны». Rosenblat Evgenij. Belarus: Specific Features of the Region's Jewish Collaboration and Resistance // Gaunt, Levine and Pelosuo (eds.). P. 273.

[21] Паводле Жарэса Мядзведзева, сталінскі антысемітызм не быў «ані этнічным, ані расісцкім, ані выкліканы рэлігійнай антыпатыяй, як у царскай Расіі». Хутчэй, «антысемітызм ператварыўся ў частку афіцыйнай палітыкі, калі стала зразумела, што Ізраіль займае прынцыповую праамерыканскую пазіцыю. Такім чынам, сталінскі антысемітызм быў цалкам «палітычным», хоць гэта можа быць толькі прыпушчэннем». Medvedev Zhores. Stalin as a Russian Nationalist // Medvedev Zhores A. and Medvedev Roy A. The Unknown Stalin. London and New York: I. B. Tauris, 2003. P. 262.

[22] «Гэтыя людзі, змагары за свабоду Польшчы, якія называюць сябе Арміяй Краёвай, былі заўзятымі антысемітамі. Іх дэвіз быў «Спачатку вынішчым яўрэяў, а пасля — немцаў». Мы ўвесь час баяліся іх». Zissman Harold (Cukierman Hersh (Grysha)). The Warriors: My Life as a Jewish Soviet Partisan. Syracuse: Syracuse University Press, 2005. P. 143—144, 153.



Дырыжабль «Hindenburg» у ангары аэрапорту Нью-Ёрку. 1936




Нацыянал-сацыялізм у нямецкай гімназіі



Сумесны савецка-нямецкі парад у Берасьці. 1939


PRAWDA WILEŃSKA

goniec codzienny

„Weissruthenische Stimme"
BIEŁARUSKI HOŁAS
TYDNIOVY ČASAPIS
Vilnia, 2 červienia 1944 h.
JEDNAŚĆ
Biez niamieckaj armii Vuhorščyna nia budzie mieć žyćcia
Pravadyr Niamieččyny

Даваенная і ваенная прэса Вільні



«Нязручныя» для савецкай прапаганды сюжэты: савецкія ваеннапалонныя кормяцца на нямецкай ваенна-палявой кухні



Падбіты савецкі бранявік. Чэрвень-ліпень 1941



Жыхарка
эўрапейскай
часткі СССР



Нямецкі тыл моцна залежаў ад конскай сілы









«Нязручныя» для савецкай прапаганды сюжэты: катастрофа Чырвонай Арміі ў 1941 годзе





Жаўнер вэрмахту гутарыць з савецкім ваеннапалонным

## ПРАБЛЕМЫ ЯЎРЭЙСКАЙ ПАРТЫЗАНКІ

Дзеля прапагандысцкіх мэтаў нацысты завышалі колькасць яўрэяў, што партызанілі ў Беларусі. Аднак яшчэ да вайны Сталін уважаў за праблему атаясамліванне ў масавай свядомасці камуністаў з яўрэйскім насельніцтвам і прыняў захады, каб разбіць гэтыя ўяўленні[23]. Савецкі ўрад нават баяўся, што існаванне такога стэрэатыпа пашкодзіць нацыянальнай бяспецы, а вера ў тое, што «ў партызанцы многа яўрэяў, скампраметуе ідэю супрацiву ў вачах мясцовага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі»[24].

Такім чынам, савецкае кіраўніцтва пайшло на свядомае заніжэнне колькасці яўрэяў у партызанскіх фармаваннях, каб не граць на руку нацыстам, якія намагаліся дыскрэдытаваць камуністычны партызанскі рух праз атаясамліванне партызан з яўрэямі. Савецкія лідэры заміналі дзейнасці яўрэйскіх партызан, абмяжоўваючы доступ да зброі.

Панцеляймон Панамарэнка, паваенны кіраўнік КПБ, у дакладзе цэнтральнаму ўраду са шкадаваннем згадваў пра малую колькасць яўрэяў у беларускай партызанцы, што, на яго думку, сведчыла пра брак савецкага патрыятызму ў палякаў і яўрэяў[25]. Панамарэнка сцвярджаў гэта, нягледзячы на тое, што сярод савецкіх шарагоўцаў і афіцэраў, якія атрымалі вайсковыя адзнакі, было непрапарцыйна шмат яўрэяў, а палякі адыгралі ключавую ролю ў партызанцы ў Заходняй Украіне[26].

Заніжэнне афіцыйнай уладай яўрэйскага ўнёску ў перамогу спарадзіла масавы стэрэатып, які Сталін праз некалькі гадоў выкарыстаў падчас кампаніі супраць касмапалітаў, калі пазбяганне яўрэямі вайсковага абавязку стане галоўным аргументам супраць іх як этнічнай супольнасці[27].

Хоць нацысты яўрэяў вынішчалі найперш, савецкі ўрад неахвотна прызнаваў трагедыю яўрэйскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі. Сам Сталін згадаў пра генацыд еўрапейскіх яўрэяў усяго толькі аднойчы — у прамове 7 лістапада 1941 г. Падчас першага перыяду вайны савецкае кіраўніцтва сцвярджала, што на акупаваных тэрыторыях немцы ставяцца да яўрэяў як да ўсіх іншых народаў. У студзені 1942 г. Молатаў пайшоў далей і абвясціў, што галоўным аб’ектам вынішчэння фашыстамі стаюцца прадстаўнікі славянскіх народаў.

[23] Ужо чысткі 1937—1938 гг. былі інтэрпрэтаваныя як спроба Сталіна супрацьстаяць уяўленню пра жыдакамуну. Святлана Алілуева тлумачыць чысткі старых партыйных функцыянераў «антысемітызмам... які ўзрос у самой партыі». Svetlana Allilueva. Only One Year. New York: Harper and Row, 1969. P. 153.

[24] Rosenblat. P. 276.

[25] Панамарэнка пісаў, што «яўрэі складаюць да 8,5 % насельніцтва рэспублікі, а сярод партызан іх толькі 2,71 %, то бок прапарцыйна яўрэяў у партызанцы ў 2,5 раза менш, чым агулам па рэспубліцы». Rosenblat. P. 281.

[26] Weiner. P. 218.

[27] Weiner. P. 229—230, 377.

Толькі ў снежні 1942 г., пасля ціску з боку яўрэйскіх грамадаў усяго свету, савецкае кіраўніцтва выдала дэкларацыю, якая называлася «Выкананне плана па вынішчэнні яўрэйскага насельніцтва Еўропы гітлераўскім рэжымам»[28].

Дакладная колькасць яўрэяў у беларускай партызанцы дагэтуль невядомая. Паводле савецкіх архіўных крыніцаў, партызанскі рух налічваў 5077 яўрэяў, ці 2,6 адсотка ад агульнай колькасці партызанаў[29]. У іншых крыніцах можна знайсці лічбу «не менш за 15 000» партызанаў і падпольшчыкаў яўрэйскай нацыянальнасці[30].

Пра ўдзел яўрэяў у вайне можна меркаваць па колькасці атрыманых імі вайсковых узнагародаў. У студзені 1943 г. у гэтым паказніку яўрэі займалі чацвёртае месца і саступалі толькі прадстаўнікам трох усходнеславянскіх народаў. У чэрвені 1943 г. яўрэяў-ардэнаносцаў стала нават больш, чым адзначаных вайсковымі ўзнагародамі беларусаў. Паводле Яна Гроса, «колькасць яўрэяў, якія ваявалі на баку савецкай дзяржавы, агаломшвае»[31].

Беларускі гісторык Яўген Разэнблат сцвярджае, што ўяўленне пра яўрэйскую пакорлівасць — гэта «міф», «больш падобны да свядомага перакручвання гісторыі, чым да выпадковай памылкі». Разэнблат піша, што «колькасць яўрэяў-удзельнікаў супраціву надзвычай вялікая. Іх было больш за прадстаўнікоў якой-кольвек іншай нацыянальнасці». Больш як палова ўсіх беларускіх яўрэяў, што перажылі вайну, удзельнічалі ў беларускім партызанскім руху[32]. Паводле Разэнблата, «антысеміцкія настроі, стэрэатып пра няздольнасць яўрэяў ваяваць і іх бяздзейнасць у войску распаўсюджваліся шэрагам партызанаў і падпольшчыкаў».

У масавую свядомасць насаджаўся міф пра яўрэяў-«ухілістаў», якія, нібыта, спакойна перачакалі вайну ў Цэнтральнай Азіі, у той час як прадстаўнікі ўсходнеславянскіх народаў гінулі на фронце. Для апісання ролі яўрэяў у вайне нават прыдумалі асобны выраз — іх называлі «ташкенцкімі партызанамі»[33]. Паводле папулярнага паваеннага жарту, для яўрэяў выраблялі скрыўленыя стрэльбы, бо тыя здольныя страляць толькі з-за вугла[34].

Нават падчас вайны яўрэі, якія ўдзельнічалі ў партызанскіх фармаваннях, мусілі трываць антысеміцкія забабоны і адказваць на правакацыйныя пытанні, кшталту таго, чаму іх суайчыннікі не ўдзельнічаюць у супраціве. Гірш Цукерман прыйшоў хлапцом у савецкі партызанскі атрад у Заходняй Беларусі адразу пас-

[28] Leonid Smilovitsky. «Antisemitism in the Soviet Partisan Movement, 1941—1944: The Case of Belorussia». Holocaust and Genocide Studies. Vol. 20. No. 2, 2006. P. 209.

[29] Rosenblat. P. 280.

[30] Smilovitsky. P. 217.

[31] Gross Jan T. Fear: Anti-Semitism in Poland After Auschwitz. An Essay in Historical Interpretation. New York: Random House, 2006. P. 203.

[32] Rosenblat. P. 281—282.

[33] Weiner. P. 221—222.

[34] Смиловицкий Леонид. Катастрофа евреев в Белоруссии. 1941—1944. Tel Aviv, 2000. P. 147—160.

ля нападу немцаў. Неяўрэі пачалі пытаць Гірша, чаму іншыя яўрэі не ідуць у лясы да партызанаў. Паводле яго словаў, партызанам было бессэнсоўна тлумачыць страх, у якім жылі яўрэі, і тое, што ў іх не было зброі. Таму Гірш шматкроць паўтараў ім, што яўрэі, з дапамогай партызанаў, гатовыя напасці на Дзярэчынскае гета і прывесці больш юнакоў у лес[35]. Падобныя стэрэатыпы жывіліся тым, што ў паваеннай савецкай гістарыяграфіі прыніжалася роля яўрэйскай партызанкі ў агульным партызанскім руху, а самі яўрэі не згадваліся падчас афіцыйных мерапрыемстваў, прысвечаных ушанаванню перамогі.

## УШАНАВАННЕ «ВЯЛІКІХ» СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

**Савецкія палітыкі, былыя партызаны, свядома кананізавалі вайну, каб замацаваць сваю ўладу і надаць сабе вобраз жывых легендаў.**

У той час, калі савецкая гістарыяграфія малявала калектыўны партызанскі подзвіг беларусаў, украінцаў і расійцаў, яўрэі атрымлівалі ўзнагароды за асабісты вайсковы гераізм, аднак для яўрэйскай грамады ў афіцыйным гераічным эпасе месца не было, яўрэі як супольнасць не згадваліся падчас урачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных ушанаванню перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне[36].

Больш за тое, гэта адпавядала афіцыйнай пазіцыі Масквы, якая ўсё больш канцэнтравала ўвагу на асаблівай ролі расійцаў у вайне. У 1945 г. Сталін абвясціў, што расійцы, як «самая выбітная нацыя краіны», мусяць быць «кіроўнай элітай Савецкага Саюза». Вылучэнне ролі славянаў агулам і расійцаў у прыватнасці ў арганізацыі супраціву нацыстам тлумачыцца тым, што пасля вайны Сталін стаў актыўней прасоўваць ідэі ўсходнеславянскага адзінства і расійскага нацыяналізму. Калі асноўныя ваенныя поспехі прыпісваліся расійцам, двум усходнеславянскім «малодшым братам» таксама адводзілася асобная выдатная роля. Пасля далучэння Украіны і Беларусі ў выніку пакта Молатава — Рыбентропа ўкраінцы і беларусы пачалі звацца «вялікімі» народамі. Раней гэтая характарыстыка выкарыстоўвалася толькі датычна расійцаў, якія, у сваю чаргу, атрымалі гэты статус у 1937 г.

У той час, калі савецкія СМІ часу вайны вылучалі беларусаў як трэцюю паводле значнасці нацыянальнасць у Савецкім Саюзе падчас святкавання датаў, звязаных з вайной і перамогай, яўрэі згадваліся нашмат радзей, чым расійцы, украінцы і беларусы. Афіцыйна роля яўрэяў была меншая за ўнёсак у перамогу народаў, што жылі далёка ад акупаваных тэрыторыяў — такіх, як бураты, чэркесы, хакасы, аварцы, кумыкі ці якуты.

[35] Zissman. P. 70.
[36] Weiner. P. 258.

## РЭСПУБЛІКА АДНАРОДНАЯ, САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСКАЯ

Існыя межы, паводле якіх Беларусь упершыню ў сваёй гісторыі стала адзінай дзяржавай, былі вызначаныя пактам Молатава — Рыбентропа і замацаваныя Ялцінскімі дамовамі. Вайна значна паскорыла працэс моўнай русіфікацыі, завяршыла працэс саветызацыі, распачаты ў 1930-я гг., і паклала канец афіцыйнаму шматмоўю, месца якога заняла расійская мова. Так, палякі пакінулі тэрыторыю Беларусі ў выніку вайны, а насельніцтва, што гаварыла на ідышы, амаль цалкам вынішчылі нацысты. У паваеннай БССР была адна супярэчнасць: яна была адначасова этнічна гамагеннай і культурна дэнацыяналізаванай.

Падчас вайны колькасць палякаў і яўрэяў у Беларусі зменшылася ў разы, што дазволіла прынізіць іх гістарычную ролю. Вайна і яе наступствы радыкальна змянілі этнічны склад беларускага насельніцтва. Не менш важна, што яна перарабіла і ўспрыманне беларускага грамадства. У выніку масавых забойстваў і этнічных чыстак былі зьнішчаныя буйныя этнічныя меншасці, што й зрабіла насельніцтва Беларусі этнічна аднародным. Больш за тое, вайна стварыла вобразы савецкага патрыятызму, дружбы народаў і ўяўленай савецкай супольнасці[37], якія замянілі старыя міфы Заходняй Беларусі і БССР, што існавалі да 1930-х гг.

Са зменай палітычнай атмасферы з рэвалюцыйнага імпэту пачатку 1920-х гг. на асцярожнейшую сталінскую палітыку, афіцыйная рыторыка стала апяваць гістарычную пераемнасць, сацыяльную гармонію, дысцыпліну і стабільнасць. За Брэжневым культ Вялікай Айчыннай вайны зрабіўся цэнтральным складнікам савецкай палітычнай міфалогіі.

*Цягам дваццаці пяці гадоў — ад моманту, калі Леанід Брэжнеў стаў генеральным сакратаром кампартыі, і да канца 1980-х гг., якія завяршыліся распадам савецкай сістэмы, партыя стварыла сапраўдны культ Вялікай Айчыннай вайны, са сваімі святымі, недатыкальнымі рэліквіямі, трывалым вайсковым метанаратывам* [...] *і тысячамі ваенных мемарыялаў* [...]. *Падобна да таго, як яўрэі ўсяго свету апелююць да шасці мільёнаў ахвяраў Халакосту, дваццаць мільёнаў грамадзян Савецкага Саюза, якія, паводле брэжнеўскага рэжыму, загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны, сімвалізуюць ачышчальную ахвяру, праз якую савецкая дзяржава мусіць прэтэндаваць на выключнае месца ў сусветнай гісторыі*[38].

Карціны ваенных пакутаў і гераізму былі афарбаваныя выключна ў нацыянальны колер. Афіцыйная прапаганда часцяком апранала патрыятычных беларускіх савецкіх партызан у беларускія народныя строі, у той час, калі яўрэйская,

[37] Martin. P. 461.

[38] Tumarkin Nina. The Living & the Dead: The Rise and Fall of the Cult of World War II in Russia. New York: Basic Books, 1994. P. 134—135.

польская ці антысавецкая ўкраінская партызанка маргіналізавалася ці замоўчвалася, што спрыяла ўмацаванню беларускага савецкага гонару[39].

Беларуска-савецкі патрыятызм надаваў легітымнасць наменклатуры БССР, якая амаль цалкам складалася з былых партызанаў. Партызанскае пакаленне ператварылася ў клас тэхнакратаў, якія захоўвалі ўладу ў БССР да свайго натуральнага скону напярэдадні распаду Савецкага Саюза. На працягу ўсяго перыяду іх кіравання, які цягнуўся больш за чатыры дзесяцігоддзі, гэтае пакаленне стварыла і ўбіла ў масавую свядомасць шэраг міфаў пра савецкую партызанку, якія ператварыліся ў паноўныя нацыянальныя міфы. З улікам таго, што беларусы шанавалі герояў Вялікай Айчыннай вайны, шэраг лідэраў БССР, якія належалі да «партызанскага пакалення», карысталіся шчырай народнай павагай[40]. Гэтыя палітыкі свядома кананізавалі вайну, каб замацаваць сваю ўладу і надаць сабе вобраз жывых легендаў.

**Аўтарытарныя рэжымы, не здольныя здабыць народную падтрымку шляхам дэмакратычных выбараў, у пошуках легітымацыі звяртаюцца да гісторыі.**

Новыя міфы добра ўкладаліся ў сталінскую сістэму[41], бо, напрыклад, Кастрычніцкая рэвалюцыя не была крыніцай патрыятызму для беларусаў праз абсалютную адсутнасць беларусаў сярод тых, хто яе здзяйсняў. Аднак сярод тых, хто рабіў Кастрычніцкую рэвалюцыю, было надзвычай шмат яўрэяў, таму яна падавалася беспаваротна «яўрэйскай». Адрозна ад яе, ваенны міф пакутаў і выкуплення меў беларускія карані і быў надзвычай папулярны сярод насельніцтва. Ушанаванне беларускіх і расійскіх партызанаў фармавала беларускую свядомасць паводле вядомага ленінскага прынцыпу «нацыянальнае па форме, сацыялістычнае па змесце». Партызанскі міф узносіў дасягненні беларусаў і адначасова прывязваў іх да братоў-расійцаў ды іншых народаў СССР. Ушанаванне ваеннага гераізму мыслілася адначасова як ода камуністычнаму кіраўніцтву і спосаб інтэграцыі беларусаў у савецкую сям'ю народаў. Нягледзячы на тое, што сталінская «дактрына вялікага брата» адышла разам з Сталіным і была замененая на ідэю зліцця ўсіх народаў СССР у адзіны савецкі народ[42], Беларусь захавала сваё прывілеяванае становішча. Рэспубліка-заснавальніца Савецкага Саюза, БССР, разам са значна большай Савецкай Украінай, атрымала месца ў ААН.

У апошнія гады свайго жыцця Сталін станавіўся ўсё большым антысемітам, і савецкаму кіраўніцтву стала відавочная неабходнасць новага міфа[43]. Вайна пе-

[39] Weiner. P. 356.

[40] Eke Steve M. and Kuzio Taras. Sultanism in Eastern Europe: The Socio-Political Roots of Authoritarian Populism in Belarus // Europe-Asia Studies, Vol. 52, No. 3 (May, 2000). P. 529.

[41] Weiner. P. 235.

[42] Gennadii Kostyrchenko. Out of the Red Shadows: Anti-Semitism in Soviet Russia. Amherst, NY: Prometheus Books, 1995. P. 29.

[43] Weiner. P. 235.

ратварылася ў трывалы калектыўны міф, з якім сябе асабіста асацыявала мноства беларусаў.

## МІФ, ЯКІ ПЕРАЖЫЎ САВЕЦКІ САЮЗ

Пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь неахвотна прыняла незалежнасць. Беларуская нацыянальная свядомасць была моцна звязаная з Другой сусветнай вайной, і ў ёй дамінавалі савецкія гістарычныя міфы. Вядома, што аўтарытарныя рэжымы, не здольныя здабыць народную падтрымку шляхам дэмакратычных выбараў, у пошуках легітымацыі звяртаюцца да гісторыі[44]. Аўтарытарны рэжым Лукашэнкі вярнуў міфалогію вайны ў беларускі палітычны дыскурс. Лукашэнкавы намаганні абгрунтаваць створаную ім сістэму сродкамі сучаснасці выявіліся марнымі. Незразумелая рыторыка ўлады, у якой заўважныя такія паняткі, як «праваслаўны атэізм» і «рынкавы сацыялізм», не спрыяюць фармаванню «дзяржаўнай ідэалогіі», стварэнне якой мае на мэце беларускі рэжым. Пазіцыя ўлады, выказаная ў падручніку па ідэалогіі для вышэйшых навучальных установаў, — у тым, што «толькі любоў да Радзімы можа зрабіць чалавека сапраўды шчаслівым... роўна як чалавек мае адну маці, гэтак жа ў яго можа быць толькі адна Радзіма»[45]. Гэта шмат у чым перагукаецца з гледзішчам Шлеермахера, які сцвярджаў: «У чалавечай свядомасці ўгрунтаваная толькі адна мова. Чалавек цалкам належыць толькі адной мове, незалежна ад таго, колькі яшчэ моваў ён вывучыць»[46]. Ва ўмовах, калі большасць беларусаў не гаворыць па-беларуску, афіцыйны нацыянальны дыскурс пабудаваны на ідэалогіі, у якой, з аднаго боку, грамадзянскае пераважае над этнічным, але, з іншага, існуе этнічнае «ядро», што складаецца з беларусаў і расійцаў.

Сталінская нацыянальная міфалогія таксама ўлучала этнічны складнік, калі ўвесь час падкрэсліваліся братэрства і еднасць усходнеславянскіх народаў. Час ад часу ў ёй праглядаўся антыпольскі кампанент, дагэтуль заўважны ў рыторыцы прэзідэнта Лукашэнкі. Нягледзячы на тое, што 78 адсоткаў насельнікаў Беларусі сёння лічаць сябе «этнічнымі беларусамі», у краіне дагэтуль застаецца 400 000 «этнічных» палякаў, якія збольшага жывуць на мяжы з Літвой і Польшчай. Палітычная сітуацыя вакол іх дагэтуль застаецца складанай. З улікам таго, што стасункі беларускага рэжыму з Захадам, і ў прыватнасці з Польшчай, застаюцца напружанымі, лукашэнкаўскія прапагандысты часта малююць беларускіх палякаў як пятую калону ў беларускай дзяржаве[47].

[44] Klas-Göran Karlsson. Historia som vapen: Historiebruk och Sovjetunionens upplösning 1985—1995. Stockholm: Natur och Kultur, 1999. P. 37.

[45] Князев С. Н. и Решетников С. В. (ред.) Основы идеологии белорусского государства: учебное пособие для вузов. — Минск: Академия при президенте Республики Беларусь, 2004. С. 80.

[46] Elie Kedourie. Nationalism. Fourth, expanded edition. Oxford and Cambridge, MA, 1993. P. 57.

[47] Allister Maunk. Lukashenko's War on Poles, 8.08.2005. Axis Information and Analysis. http://www.axisglobe.com/article.asp?article=294 (accessed April 4, 2007).

Сённяшняе кіраўніцтва Беларусі свядома эксплуатуе ваенную героіку. У той час, як ва ўкраінскай ваеннай міфалогіі цэнтральнае месца адводзілася пакутам нацыі, падобны «культ калектыўнай пакуты» не быў уласцівы для Беларусі, насельнікі якой лічылі сябе часткай савецкага народу і ганарыліся перамогай у Вялікай Айчыннай вайне. У 1995 г. Лукашэнка сваім указам перанёс Дзень незалежнасці рэспублікі з 27 ліпеня, дня абвяшчэння незалежнасці ў 1990 г., на 3 ліпеня, дату вызвалення Мінска ад нямецкіх захопнікаў у 1944 г. Шараговыя беларусы разглядаюць вяртанне Чырвонай Арміі як сапраўднае вызваленне Беларусі. Аднак для Лукашэнкі гэта нешта большае. Усталяванне савецкага ладу сёння афіцыйна святкуецца як найзначнейшая дата сучаснай беларускай гісторыі.

Аднак Лукашэнкава настальгія па савецкім часе надзвычай выбіральная. Рэжым амаль ніколі не звяртаецца да тэмы Кастрычніцкай рэвалюцыі. Міфалагема Вялікай Айчыннай вайны стаецца ключавой адзнакай лаяльнасці рэжыму. З улікам значнай колькасці пенсіянераў, шмат хто з якіх служыў у савецкім войску, настальгія па савецкім мінулым прымае формы палітычнага кічу, які знаходзіць сталую падтрымку ў асноўнай масы Лукашэнкавага электарату[48].

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г. па ўсёй краіне з'явілася серыя плакатаў пад лозунгам «За Беларусь!». Скіраваныя на выяўленне адзінства нацыі і аднаўленне нацыянальнай згоды, плакаты ілюструюць тое, з чым асацыюе сябе рэжым. Ваенны гераізм і слаўнасць савецкага мінулага перадаюцца ў тыпова савецкай манеры. У межах гэтай прапагандысцкай кампаніі прасоўваліся такія каштоўнасці сённяшняй улады, як гераізм, пільнасць, патрыятызм і стабільнасць. Яны ўвасобіліся ў адпаведна выяўленых вобразах ветэранаў вайны і прафесійных вайскоўцаў. На шэрагу плакатаў адлюстраваныя ветэраны, якія перадаюць свой досвед і каштоўнасці наступнаму пакаленню.

Мінскі гісторык Аляксей Літвін сцвярджае: той факт, што беларускія нацыяналісты падчас вайны супрацоўнічалі з фашыстамі, дазволіў савецкаму рэжыму дыскрэдытаваць «ідэю беларускага адраджэння, дзяржаўнасці і войска як падмуркаў незалежнай дзяржавы»[49]. Савецкаму рэжыму ўдалося дасягнуць частковавага поспеху праз прывязку беларускага нацыянальнага руху да здрады і фашызму. Так, «змаганне супраць фашыстаў парадаксальным чынам ператварылася ў барацьбу з беларускай нацыянальнай ідэяй, беларускай дзяржаўнасцю і войскам. Нечага лепшага для Масквы і існай [савецкай] сістэмы і быць не магло. (...) Пасля перамогі над Германіяй [савецкае] кіраўніцтва ўяўляла, што адначасова з ёй назаўжды вынішчаныя, пахаваныя і зганьбаваныя былі «гітлераўскія памагатыя» — «украінскія, беларускія, эстонскія, латышскія, літоўскія, польскія» і іншыя «буржуазныя нацыяналісты»[50].

[48] Александр Федута. Лукашенко: политическая биография. — Москва: Референдум, 2005. С. 105, 107.

[49] Аляксей Літвін. Акупацыя Беларусі (1941—1944): Пытанні супраціву і калабарацыі. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. С. 166.

[50] Літвін. С. 166.

*Савецкая ўлада выкарыстала вайну не толькі для таго, каб легітымізаваць уладу былой партызанскай эліты, але й для дыскрэдытацыі варожых савецкай уладзе нацыяналістаў. Маніпулюючы міфамі мінулага, савецкі ўрад вызначаў, хто належаў да савецкай сям'і народаў, а хто не. Лукашэнка працягнуў гэтую практыку і фактычна прыраўнаў нацыяналістычную апазіцыю да здраднікаў, фашыстаў і агентаў Захаду*[51].

Вайна наклала свой адбітак на ўсё. Як заўважыў Амір Вэйнэр у сваім дасьледаванні спадчыны Другой сусветнай вайны ў Савецкай Украіне,

**Лукашэнка фактычна прыраўнаў нацыяналістычную апазіцыю да здраднікаў, фашыстаў і агентаў Захаду.**

*праз пастаянны, руцінны абрад ушанавання памяці пра вайну, тыя, хто ваяваў, працягваюць перажываць вайну праз дзесяцігоддзі пасля яе заканчэння, а тыя, хто нарадзіўся пасля вайны, дэ-факта ўдзельнічаюць у рытуале. Згадкі пра вайну ўплеценыя ў кожную сферу жыцця простага чалавека. Ад пачатковай школы і да самага дарослага жыцця, праз цырымонію атрымання пашпарта і прыняцця прысягі ў савецкім войску, падчас шлюбу і святаў, якія шануюць старэйшае пакаленне, — ва ўсім у пэўнай форме прысутнічала вайна... не кажучы пра незлічоныя сустрэчы з ветэранамі фронту і партызанамі, якія ідэалізавалі вайну ў вачах маладога пакалення. Жывое ўвасабленне міфа размывала розніцу паміж асабістым досведам і памяццю, удзельнікамі вайны і наступнымі пакаленнямі*[52].

## ВЫСНОВЫ

Вялікая Айчынная вайна не толькі спрычынілася да аб'яднання беларускіх зямель, але й стала цэнтральнай міфалагемай паваеннага беларускага грамадства. Пры тым, што ўшанаванне перамогі ў Другой сусветнай вайне застаецца значнай падзеяй для ўсіх урадаў краін СНД, нідзе яму не надаюць большай увагі, чым у беларускай гістарыяграфіі. Інстытуцыяналізаваная настальгія па савецкім часе стала нарожным каменем дзяржаўнай палітыкі сучаснай Беларусі. Да таго ж яна застаецца асноўнай крыніцай тоеснасці старэйшага пакалення беларусаў. Тым не менш, у час, калі тры суседы Беларусі ўвайшлі ў Еўрасаюз, а Украіна паволі выходзіць з арбіты палітыкі Масквы, беларускі рэжым усё больш нагад-

[51] Выступление Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко на торжественном собрании, посвященном 60-й годовщине освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков и Дню Независимости Республики Беларусь (Дню Республики) 3 июля 2004 года. http://www.president.gov.by/press13450.html#doc.

[52] Weiner. P. 343—344.

вае палітычную анамалію. Пытанне ў тым, наколькі яшчэ хопіць ваеннага сімвалізму для падтрымання дзяржаўнай ідэалогіі беларускага рэжыму. Асаблівую цікавасць выклікае, наколькі маладое пакаленне, якое не мела досведу жыцця ў Савецкім Саюзе, гатовае прыняць настальгію па ўсім савецкім як аснову свайго светаўспрымання. Моладзі патрэбны альтэрнатыўны набор міфалагем і, як вынік, новы палітычны наратыў. Палітычныя падзеі ва Украіне, Літве і Польшчы не застануцца незаўважнымі ўсё больш мабільнай і глабалізаванай беларускай моладдзю. Таму пытанне, як доўга яшчэ існы рэжым здолее эксплуатаваць настальгію па савецкім часе, застаецца адкрытым. Нягледзячы на тое, што геаграфічныя і дэмаграфічныя наступствы пакта Молатава — Рыбентропа былі замацаваныя ў 1975 г. Хельсінкскім актам, палітычнае значэнне гераічнага эпасу пра перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне паступова знікае разам з адыходам паваеннага пакалення, якое было носьбітам савецкай традыцыі.

Настальгія Лукашэнкавага рэжыму па савецкім мінулым не мае аналагаў у еўрапейскіх краінах і, здаецца, дажывае апошнія гады. Масавыя забойствы і этнічныя чысткі падчас Другой сусветнай вайны назаўжды змянілі дэмаграфічны склад беларускага насельніцтва, што паспрыяла стварэнню унікальнай гераічнай міфалогіі, якая перажыла Савецкі Саюз амаль на два дзесяцігоддзі.

*З ангельскай пераклаў Алесь Мартынаў паводле аўтарскага рукапісу*